незалежная газета

# Наша Ніва

№ 23 (621) 17 чэрвеня 2009 www.nn.by

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Ці лёгка Крамлю скінуць Лукашэнку?**

Старонка 5

**Самыя высокааплатныя вакансіі сталіцы**

Старонка 4

**Падпішыся на другое паўгоддзе**

Старонка 2




## У НУМАРЫ

**Трэці лішні**
Малочная вайна — вынік лукашэнкаўскіх спробаў сутыкнуць Пуціна і Мядзведзева, мяркуе Віталь Тарас. **Старонка 5.**

**Абрабаваная кватэра дырэктаркі «Белсату»**
Агнешка Рамашэўская падазрае беларускія спецслужбы. **Старонка 9.**

**Бардэль імя Гогаля**
на літоўскай мяжы. Рэпартаж з Be2gether. **Старонка 9.**

**Помнік Міндоўгу на народныя грошы**
паўстане ў Навагрудку. **Старонка 10.**

**Хто аўтар «Пінскай шляхты»?**
Толькі, напэўна, не Дунін-Марцінкевіч. Мовазнаўцы Мячкоўская і Клімчук, гісторык Ільін пакрыху набліжаюцца да раскрыцця загадкі. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Апякліся на малацэ

**З 9.00 серады Беларусь увяла ўзмоцнены кантроль на мяжы з Расіяй.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Колькі ўжо было гандлёвых войнаў між Беларуссю і Расіяй — цукровая, мясная, нафтавая, газавая. Аднак раней вакол гэтых процістаянняў не было столькі шуму і істэрыкі, як цяпер, вакол вайны малочнай.

Канфлікт пачаўся 6 чэрвеня, калі галоўны дзяржаўны санітарны доктар РФ Генадзь Анішчанка абвясціў пра забарону на ўвоз у Расію 500 відаў беларускай малочнай прадукцыі. Першапачатковай прычынай называлася тое, што беларускія вытворцы не пераафармілі дакументацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічнага рэгламенту, якія набылі моц яшчэ ў снежні 2008 году.

Яшчэ напярэдадні забароны праблему паставак малака з Беларусі абмяркоўвалі прэм'ер-міністр суседняй дзяржавы Уладзімір Пуцін і губернатар Белгародскай вобласці Яўген Саўчанка. Кіраўнік расійскага ўраду гаварыў пра неабходнасць стварэння роўных умоваў для вытворцаў. Маўляў, расійскія датацыі складаюць толькі 3%, а ў беларусаў аж 24%. Прычым тыя 24% Расія сама фінансуе танным палівам і крэдытамі.

«Беларусь сёння знішчае нашу малочную галіну. Можа быць, гэта робіцца мэтанакіравана», — выказаў меркаванне губернатар. «Я пра гэта Аляксандру Рыгоравічу сказаў. Ён чалавек арыгінальны, адказ у яго быў такі: «Няхай вашы не пішчаць, няхай зніжаюць выдаткі», — сказаў прэм'ер-міністр.

Для Генадзя Аніштанкі не ўпершыню выходзіць на вялікую палітычную сцэну. Некалі гэты чалавек абвяшчаў пра забарону на ўвоз у Расію малдаўскага віна, грузінскай мінералкі, латвійскіх шпротаў, польскага мяса. Але для ўсіх было абсалютна відавочна, што выпадкі тыя мелі хутчэй палітычнае, чым гаспадарчае адценне. Усе забароны адбываліся падчас абвастрэння адносінаў Расіі з дадзенымі дзяржавамі.

**Працяг на старонцы 3.**

**Абмен пагрозамі**
Ананімны супрацоўнік адміністрацыі Мядзведзева: «У нас няма асаблівага засмучэння адносна паводзінаў Беларусі. Відаць, некаму проста надакучыла быць прэзідэнтам Беларусі».



**Маршруты па Беларусі:**

## сінія цэрквы

Здзітава—Жабінка—Збірагі. На радзіме Касцюшкі захавалася некалькі рэліквій драўлянага дойлідства. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 11.**

# Вярніце мову

**Зварот 203-х людзей навукі, культуры і бізнэсу, падтрыманых студэнтамі, да Аляксандра Лукашэнкі.**

Спрэчны — звяртаюцца да чалавека, які да моўнага завалу прыклаўся; і драматычны — ідзе ад сэрца — зварот Аляксандру Лукашэнку, Барысу Батуру, Уладзіміру Андрэйчанку і Сяргею Сідорскаму накіравала ініцыятыўная група грамадзянаў.

«На пачатку 2009 году ЮНЕСКА аднесла мову беларусаў да моў, якія апынуліся пад пагрозай поўнага знікнення, — так зачынаецца зварот. — Таму мы з трывогай у сэрцы звяртаемся да кожнага беларуса: «Шаноўны, што ты можаш зрабіць, каб жыла і развівалася ў кожнай сям'і і ў роднай краіне дзяржаўная беларуская мова?» Найперш мы звяртаемся да гаранта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; дазвольце, Аляксандр Рыгоравіч, паставіць перад Вамі пытанні».

Тон звароту прасіцельны: «Мы спадзяемся на Ваша разуменне і зацікаўленасць прадметам размовы. Мы спадзяемся, што Вы не дапусціце знікнення Беларусі з палітычнай карты свету, і адсюль пытанне:

ці не паставілі б Вы перад дзяржаўнымі службамі задачу распрацаваць больш годную нацыянальную палітыку?

Ці не маглі б Вы падаць асабісты прыклад — вярнуцца да практыкі ўжывання роднай мовы ў дні ўсенародных урачыстасцяў і ў дакладах па найбольш важных праблемах нацыянальнага жыцця?

Наша родная мова яшчэ не згублена, бо захоўваюцца яе карані ў народзе, яшчэ жывая, так бы мовіць, грыбніца, гатовая прыняць шчыры клопат і ласку ад дзяржавы, каб адрадзіцца, ачысціцца і пайсці ў рост. Але ж, не сакрэт, шмат хто баіцца размаўляць на роднай мове, асабліва ў дзяржаўных структурах, таму:

ці не знялі б Вы ганебнае таўро ненадзейнага чалавека, альбо яшчэ горш «апазіцыянера» з тых грамадзян, якія ведаюць беларускую мову і з задавальненнем карысталіся б ёю, калі б не баяліся, што іх залічаць у ворагі афіцыйнага курсу?

У гэтай жа сувязі:

ці не паставілі б Вы перад дыпламатычным корпусам і супрацоўнікамі афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі задачу: выглядаць больш карэктна і весці размову па-беларуску ... ?

**Працяг на старонцы 7.**

КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

## Іран: Салідарнасць

Мы, беларусы, ведаем, што такое маніпуляцыя грамадскай думкай праз СМІ і што такое абавязковая дзяржаўная ідэалогія. Нам лёгка зразумець матывы, якія кіруюць прыхільнікамі іранскай апазіцыі.

У Іране мае месца такое ж сутыкненне дэмакратычнай і аўтарытарнай мадэляў кіравання, як і на постсавецкай прасторы.

Ахмадзінеджад — кіраўнік таго ж тыпу, што і Лукашэнка, Чавэс і Мугабэ. Ён прыйшоў да ўлады на папулісцкай праграме і грунтаваў далейшую папулярнасць на масавым прамыванні мазгоў і задзіранні з Захадам. Іхняя рыторыка аднолькавая да болю: усе, хто супраць іх, гэта «адмарозкі, якія адпрацоўваюць гранты». Іранскі гарлахват яшчэ і зняславіў сваё імя адмаўленнем Халакосту (за якім стаіць вар'яцкая прага новага Халакосту), так як Лукашэнка назаўжды будзе асацыявацца з выказваннем пра «не ўсё толькі кепскае ў Гітлеру».

Аятала Хамэнэі і Ахмадзінеджад працягваюць свае небяспечныя мары пра сусветнае панаванне ісламу ў яго шыіцкім варыянце.

Мусаві — такі ж прыхільнік пабудовы краіны ў адпаведнасці з нацыянальнымі і рэлігійнымі традыцыямі, як і яго апанент. Аднак ён і прыхільныя да яго аятолы належаць хутчэй да мусульманскага варыянту еўрапейскай «хрысціянскай дэмакратыі». Вакол яго з'ядналася незалежнае грамадства Ірану, што ўжо само сабой ёсць знакам.

Перамагчы папулізм, узброены электроннымі СМІ і які не вагаецца ўжываць сілу, няпроста. Гэта патрабуе і смеласці, і арганізатарскіх здольнасцяў, і проста ўдачы. Вынік тэгеранскіх маніфестацый няпэўны. Мы ў сваіх думках — з тымі, хто кінуў выклік няволі. Нашы сімпатыі — з іранскімі студэнтамі, а не з басіджамі.



# У Славаччыне адбілі ўзоры беларускіх манет

**Да канца году тамтэйшы манетны двор гатовы вырабіць 110 мільёнаў манет для Беларусі. З гэтага можа вынікаць, што ўлады рыхтуюць дэнамінацыю.**

Афіцыйнай замовы на чаканку абаротных беларускіх манет на Манетным двары Славакіі з боку Нацбанку Беларусі не было. Гаворка пра ініцыятыву самога манетнага двара, які адбіў узоры і накіраваў прапанову Нацбанку.

Адказу ад беларускіх уладаў кіраўніцтва манетнага двара яшчэ не атрымлівала, хоць, паводле звестак БелаПАН, інфармацыйная сустрэча з прадстаўнікамі Нацбанку ўсё ж адбылася.

Інфармацыя пра чаканку ўзораў беларускіх манет ужо з'явілася на буйным спецыялізаваным сайце. Там і выкладзенае пакуль што адзінае фота ўзораў беларускіх манет.

Згодна з інфармацыяй, размешчанай на гэтым сайце, адбітыя ўзоры беларускіх манет наміналам 5, 10, 20, 50 капеек і 1 рубель.

Да канца 2009 г. на Манетным двары гатовыя вырабіць 110 мільёнаў манетаў. Аўтар паведамлення мяркуе, што ў канцы 2009 г. у Беларусі чакаецца дэнамінацыя 1:1000.

Начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанку заявіў, што сапраўды вывучаюцца магчымасці манетных двароў — у тым ліку і Славаччыны, але гэта не звязана з тэрміновай неабходнасцю ўвядзення манет у абарачэнне.

Пры гэтым прадстаўнік Нацбанку нагадаў, што ўвесь працэс вытворчасці грошай з'яўляецца дзяржаўнай таямніцай.

Поўная дэнамінацыя не прыводзіць да страты вартасці назапашаных грошай. Апошні раз дэнамінацыя рубля 1:1000 праводзілася ў Беларусі ў 2000 годзе.

**Аляксей Арэшка, Вольга Мачалава, БелаПАН; МБ**

### ARCHE ў Наваполацку

Прэзентацыя «Полацкага нумару» часопісу ARCHE мае адбыцца 18 чэрвеня а 19-й у Наваполацку. У прэзентацыі возьмуць удзел рэдактар часопісу Валер Булгакаў, Уладзімір Арлоў, Лявон Баршчэўскі. Даведацца пра месца сустрэчы можна ў сябраў ТБМ.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Пілігрымка ў Будслаў

27 чэрвеня на Будслаўскі фэст рушыць пілігрымка з Мінску. Ад Чырвонага касцёлу пойдзе посная пілігрымка, астатнія – ад Катэдры. Запісацца можна да 20 чэрвеня. Таксама дабрацца да Будслава можна будзе аўтобусамі ад Чырвонага касцёлу. 1 ліпеня — выезд у 17.00 і 19.00 (кошт 25 000 рублёў). 2 ліпеня — выезд у 06.30 (кошт 20 000 рублёў). Даведкі праз т.: **(017) 200-44-15.**

**НШ**

### ЕГУ запрашае

Прыём дакументаў на завочныя бакалаўрскія праграмы Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту праходзіць да 24 ліпеня (1-я плынь). Прыём дакументаў другой плыні будзе праводзіцца з 27 ліпеня па 21 жніўня. Падрабязнасці на сайце www.ehu.lt.

# Падпішыся на другое паўгоддзе!

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй
## за ахвяраванні

**Вячаславу Ш.**, **Веры Ч.**, **Віктару З.**, **А.Б.**, **Валерыю Б.**, **М.Ш.** з Брэсту.

**Аляксею Ш.**, **Аляксандру К.**, **Алесю Б.**, **Валерыю П.**, **Алесю Б.**, **Валерыю П.** з Баранавіцкага раёну.

**А.А.**, **А.К.**, **Вользе П.** з Магілёва.

**Міхаілу Б.**, **Аляксандру Р.**, **Л.А.** з Полацкага раёну.

**В.Д.**, **Багдану Дз.**, **Ю.К.**, **Аляксандру Л.** з Гомеля.

**В.С.**, **В.М.** з Лепельскага раёну.

**Валянціне Ш.**, **Ірыне Ц.** з Жыткавіцкага раёну.

**В.Л.**, **Адзе Р.** з Шаркоўшчынскага раёну.

**А.Т.** з Смалявіцкага раёну.

# Апякліся на малацэ

Працяг са старонкі 1.

Пытанне прыватызацыі беларускіх малочных заводаў Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмяркоўвалі яшчэ падчас сакавіцкай сустрэчы ў Завідаве. Малакаперапрацоўчая галіна ў Беларусі з'яўляецца адной з самых прыбытковых, а гэта значыць і ласых для замежнага інвестара. Значная ж частка экспарту ідзе менавіта ў Расію. Меркавалася, што гэтая тэма прагучыць і на пасяджэнні саўміну саюзнай дзяржавы, які нядаўна праходзіў у Мінску.

Тым не менш, А.Лукашэнка неаднаразова заяўляў, што Беларусь не збіраецца прадаваць гэтыя прадпрыемствы, бо ўклала ў іх вялікія грошы.

Яшчэ праз тры дні пасля першай забароны Генадзь Аніштчанка заявіў, што Расія ўводзіць абмежаванне на ўвоз яшчэ 800 найменняў беларускай малочнай прадукцыі. Увесь гэты час ішлі перамовы аб узнаўленні паставак малака, аднак яны не давалі плёну.

У суботу 13 чэрвеня Лукашэнка правёў аператыўную нараду па сітуацыі з малаком. Менавіта тады і было прынятае рашэнне байкатаваць саміт АДКБ, што на наступны дзень мусіў адбыцца ў Маскве. Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей папрасіў свайго казахскага калегу «з разуменнем успрыняць беларускую пазіцыю, паколькі эканамічная бяспека з'яўляецца складнікам бяспекі ў цэлым, і ў дадзенай сітуацыі гаварыць пра вайсковую бяспеку не выпадае».

Таксама адбываліся тэлефонныя размовы Сяргея Сідорскага з Уладзімірам Пуціным, Сяргея Мартынава з Сяргеем Лаўровым, Юрыя Жадобіна з Мікалаем Патрушавым. Напэўна, афіцыйны Мінск усё ж спадзяваўся, што праблему можна вырашыць шляхам шантажу. Не даяце нам прадаваць малако — а мы вам саміт сарвём. Анягож! І Лукашэнка ў Маскву не паляцеў. Упершыню за час свайго кіравання Лукашэнка адважыўся на такі крок непадпарадкавання ў дачыненнях з Масквой.

«Мы з'яўляемся сведкамі адкрытай эканамічнай дыскрымінацыі з боку аднае з дзяржаваў АДКБ супраць Беларусі па важнай таварнай групе. Падобныя дзеянні аб'ектыўна падрываюць эканамічную бяспеку — гэта значыць асноўу асноваў стабільнасці і, адпаведна, комплекснай і ўсёабдымнай бяспекі», — сурова заявіў прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў.

На той самай нарадзе па малацэ Лукашэнка даў загад Дзяржаўнаму памежнаму камітэту прапрацаваць пытанне аб мытным і памежным кантролі на граніцы з Расіяй.

У сваю чаргу Дзмітрый Мядзведзеў сказаў, што пытанне паставак малака «чыста тэхнічнае, якое можна было б вырашыць дастаткова хутка, каб не палітызацыя і жаданне ўсё звязаць з АДКБ». Мядзведзеў быў абураны тым, што Лукашэнка не патэлефанаваў яму асабіста і не растлумачыў сітуацыю. Нават больш: ён назваў рухі Лукашэнкі «мяса-малочнай істэрыкай».

Расійскі «Камерсант» піша пра тое, што Крэмль не збіраецца ісці на саступкі Беларусі, а гатовы да жорсткага супрацьстаяння. Ананімны суразмоўца выдання з адміністрацыі Мядзведзева зазначыў: «У нас няма асаблівага засмучэння адносна паводзінаў Беларусі. Відаць, некаму проста надакучыла быць прэзідэнтам Беларусі».

Калі да мінулай пятніцы дзяржаўная прапаганда замоўчвала маштаб праблемы, то ад суботы яна зрэагавала знарочыстай інфармацыйнай кампаніяй. Экстраныя інфармацыйныя выпускі ішлі адзін за адным, хоць нічога не мянялася. Маўляў, мы да іх з самымі чыстымі намерамі, а яны гэтак не па-суседску да нас. Самі прымушаюць Беларусь павярнуцца ў бок Еўропы, звыкла палохаюць прадстаўнікі дзяржаўных СМІ. Як прыклад таго, што нас там чакаюць, прыводзяць прыклад новага крэдыту ад МВФ у 1 мільярд даляраў. У той час як Расіі адмаўляецца пераводзіць апошнюю траншу крэдыту ў памеры 500 мільёнаў даляраў.

У сваю чаргу, прэм'ер-міністр Расіі кпліва парэкамендаваў чыноўнікам не крыўдзіцца на рэзкія заявы беларусаў: «Некарэктна, нядобра крыўдзіцца. Крызіс, стамляльнасць, стрэсы. Я выхоўваўся на ленінградскай вуліцы, дзе ў нас у такіх выпадках казалі: «Хто як абзываецца, так і называецца».

Малочная вайна, мусіць, зацягнецца на некалькі тыдняў. Расія бярэ тайм-аўт у перамовах па пастаўках беларускай малочнай прадукцыі на свой рынак, заявіў раніцай 16 чэрвеня кіраўнік Генадзь Аніштчанка, спаслаўшыся на неканструктыўны тон заяваў БТ і «СаўБеліі». Колькі працягнецца гэты «тайм-аўт» пакуль не бярэцца гадаць ніхто. Вайна працягваецца.

З 9.00 серады Беларусь увяла ўзмоцнены кантроль на мяжы з Расіяй.

**Зміцер Панкавец**

# Іран як Беларусь

**Прэзідэнцкія выбары ў Іране скончыліся шматтысячнымі акцыямі пратэсту.**

Пераможцам выбараў быў абвешчаны цяперашні прэзідэнт краіны Махмуд Ахмадзінеджад. Паводле афіцыйных звестак, ён набраў больш за 62% галасоў выбарцаў. Галоўны супернік, былы прэм'ер-міністр Мірхасэйн Мусаві — 33%.

Тым не менш, прадстаўнікі апазіцыйнага кандыдата заяўляюць, што ў іхні штаб быў званок ад вярхоўнага кіраўніка Ірану Аяталы Хамэнэі, які павіншаваў Мусаві з перамогай і папрасіў падрыхтаваць выступ. Аднак літаральна праз некалькі гадзін сябры Рады вартаўнікоў Канстытуцыі паведамілі аб прыкрай памылцы.

Нягледзячы на паразу, Мусаві апярэдзіў Ахмадзінеджада ў сталіцы і ў рэгіёнах, населеных нацыянальнымі меншасцямі (Курдыстан, Азербайджан, Белуджыстан). За апазіцыянера галасавалі ў асноўным гараджане. Мусаві адразу заявіў пра фальсіфікацыі, а таксама непрызнанне паразы.

Незадаволенасць вынікамі выбараў вылілася ў шматтысячныя маніфестацыі ў Тэгеране і іншых гарадах краіны. Сотні тысяч, а можа нават мільёны людзей падчас мітынгу ў панядзелак скандавалі: «Аллах акбар». Такіх масавых дэманстрацый яшчэ не было за 30-гадовую гісторыю існавання Ісламскай рэспублікі.

Улады рабілі ўсё, каб сарваць выступ апазіцыі. Праца інтэрнэту ў краіне была замаруджаная. Уначы спецслужбы арыштавалі амаль 150 студэнтаў, прыхільнікаў апазіцыі. Ва універсітэцкім гарадку — асноўнай базе апазіцыі — яны разгрэмілі сядзібы незалежных арганізацый. У краіне глушыцца трансляцыя замежных станцый, якія надаюць на фарсі.

Нягледзячы на гэта, праціўнікі існага ладу запоўнілі цэнтральныя вуліцы сталіцы. Вялізная людская рака тры гадзіны плыла ад плошчы Рэвалюцыі да плошчы Свабоды ў Тэгеране. Калона расцягнулася на шэсць кіламетраў. У адрозненне ад шумных дэманстрацый у студэнцкім гарадку, вялікі марш праходзіў пераважна моўчкі, амаль у поўнай цішыні. Такое было рашэнне арганізатараў.

Акцыі пратэсту далі пэўны вынік. Рада вартаўнікоў Канстытуцыі прыняла рашэнне аб гатоўнасці да пераліку галасоў. Разам з тым, яны кажуць, што ніякіх перавыбараў не будзе.

Пакуль няясна, ці ёсць у Мусаві план дзеянняў. Сілавыя структуры застаюцца пад кантролем Ахмадзінеджада, а народныя масы — пад уплывам прапаганды дзяржаўнага ТВ.

**МБ, ЗП**

**Відэа і фоты з закрытай краіны прабіваюцца за мяжу дзякуючы інтэрнэту — пратэстоўцы выкарыстоўваюць flickr.com і twitter.com.**




## СЦІСЛА

### Палкоўнік Паўлічэнка сышоў у адстаўку

Першы камандзір спецыяльнага атрада хуткага рэагавання ўнутраных войскаў МУС палкоўнік Дзмітры Паўлічэнка яшчэ ў сакавіку пайшоў у адстаўку. Прычына – хвароба.

### Беразоўскі быў на судзе ў Мінску

Пра гэта расказала сакратарка амерыканскага адваката Эмануіла Зельцера Уладлена Функ у інтэрв'ю сайту naviny.by. Таксама Функ агучыла падрабязнасці арышту. У прыватнасці, яна гаворыць пра тое, што ў Мінск іх даставілі ў непрытомным стане на самалёце Беразоўскага.

### Ферэра-Вальднер усё ж прыедзе

Камісар Еўрасаюзу па вонкавых сувязях і еўрапейскай палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднер наведае Мінск 21-22 чэрвеня. Некаторыя інфармацыйныя агенцтвы паведамляюць, што Лукашэнка адправіў зварот еўракамісару, дзе прасіў як мага хутчэй прыехаць.

### Кангрэс еўрапейскага выбару

пройдзе ў Мінску 20 чэрвеня. Пра гэта паведаміў старшыня аргкамітэту Мікола Статкевіч. Пасяджэнні будуць адбывацца ў Палацы культуры МТЗ.

### Памёр журналіст Аляксандр Міхальчук

Яму было 53 гады. У свой час Міхальчук працаваў у агенцтве БЕЛТА, часопісе «Дело», «Белорусской деловой газете», «Белорусской газете». Апошнім часам займаўся перакладамі.

### Аднаго амніставалі, іншага — асудзілі

Фігурант «Працэсу чатырнаццаці» Максім Дашук асуджаны да году і трох месяцаў «хатняй хіміі». Суддзі Кузняцовай спатрэбілася дзве гадзіны, каб вынесці прысуд.

Дашука абвінавачвалі ў парушэнні артыкулу 415 КК («Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі»). Гэты артыкул прадугледжвае толькі зняволенне, але да хлопца былі прыменены змякчальныя абставіны — непаўналецце і смерць бацькі.

Разам з тым, 11 чэрвеня быў амніставаны іншы ўдзельнік «Працэсу чатырнаццаці» — Міхаіл Пашкевіч.

У дачыненні яшчэ двух удзельнікаў «Працэсу чатырнаццаці», Алеся Чарнышова і Алеся Стральцова, прыменена змякчэнне меры пакарання. Абмежаванне волі ім замянілі на папраўчыя працы з вылічэннем 20% ад заробку.

**ЗП**

# Самая запатрабаваная праца ў Мінску — прыбіральшчык

А ў абласцях — кіроўца.

Колькасць людзей, якія зарэгістраваліся ў органах занятасці і атрымалі статус беспрацоўных, моцна розніцца з рэальнымі лічбамі грамадзянаў, якія не маюць працы. Дзяржаўная статыстыка сведчыць, што на 1 чэрвеня толькі 43,2 тысячы беларусаў прылічваюцца да беспрацоўных. Такім чынам, узровень беспрацоўя ў Беларусі як быццам бы складае нават менш за 1%.

Вакансій магло б хапіць на ўсіх ахвотных — у краіне 44 тысячы вольных працоўных месцаў. Мінск шукае, кім запоўніць 15,6 тысяч вакансій.

### Дапамога беспрацоўным

Беспрацоўныя спрабуюць уладкавацца самі, а таму не ўваходзяць у афіцыйны спіс. Большасць людзей без працы не рэгіструецца ў аддзелах занятасці. Ім непатрэбная штомесячная «дапамога» — падачка памерам менш за 50 тысяч рублёў. У дадатак людзям прыходзіцца выконваць неаплачваемыя «грамадскія працы» — месці лісце, прыбіраць снег.

Дапамогу, якую аказвае дзяржава сваім грамадзянам (каля 16 даляраў), цікава параўнаць з той, якую атрымліваюць суседзі. Толькі ў Польшчы дапамога беспрацоўным фіксаваная — 170 даляраў. Але яна выплачваецца толькі тым, чый працоўны стаж перавышае пяць гадоў. Тыя, хто працаваў менш працяглы тэрмін, сядзяць без грошай. У астатніх краінах-суседках фіксаванага паказальніку няма. У Расіі ў залежнасці ад стажу і кваліфікацыі выплачваецца 25-140 даляраў. Ва Украіне — ад 50 даляраў, але не больш за сярэдні заробак па рэгіёне — сярэдняя дапамога выходзіць у памеры 86 даляраў. У Літве ж сярэдні памер — 280 даляраў. У 17 разоў больш за беларускі...

### Вышэйшая адукацыя не дае перавагі ў заробку

Карэспандэнт «НН» звярнуўся ў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкаму, каб высветліць, якія працаўнікі самыя запатрабаваныя, а спецыялістаў якіх прафесій няма куды ўладкоўваць. «Складаная сітуацыя з эканамістамі і юрыстамі — іх зашмат, яны чакаюць высокааплачваемую працу. Зразумела, што на ўсіх вакансій не хапае», — тлумачаць спецыялісты.

Самай запатрабаванай працай у Мінску аказалася праца... прыбіральшчыка! На далёка не самую прэстыжную працу прэтэндэнтаў няшмат, вось і назбіралася ажно 159 вакансій, з заробкам ад 150 да 600 тысяч рублёў. Услед за імі — слесары-сантэхнікі (да 1,2 мільёна), прадаўцы (да 800 тысяч) і дактары (да 1 мільёна). З пералічанага «хіт-параду» самых запатрабаваных прафесій вышэйшая адукацыя патрэбная толькі доктару. І тое заробкі медыкаў не большыя за прадстаўнікоў іншых прафесій. А вось для журналістаў у сталіцы ёсць толькі тры месцы (600 тысяч), але нават на іх не знаходзяцца ахвотнікі.




**Самыя «дарагія» вакансіі ў Мінску.**

**1. Галоўны архітэктар праекту ў СП «Бакемін» (3 мільёны рублёў).**

**2. Галоўны інжынер у інстытуце РУП «Белгіпраторг» (2,9 мільёна).**

**3. Каменячос-гранітчык аддзялення Беларускай чыгункі (2,5 мільёна).**

### За МКАДам у пашане рабочыя спецыяльнасці

Самы вялікі дэфіцыт у абласцях — кіроўцаў аўтамабіляў і трактароў (да 1 мільёна рублёў). Агулам на прадстаўленыя вакансіі трэба набраць больш за тысячу чалавек!

Асаблівасць беларускай біржы працы ў тым, што тры чацвёртыя вакансій — па рабочых спецыяльнасцях. У сталіцы гэта праяўляецца не так моцна, але ў абласцях у пашане перадусім электрагазазваршчыкі (заробак да 1 мільёна рублёў), муляры (да 1,5 мільёна), цесляры (да 1 мільёна).

**Ягор Марціновіч**

## Рэзервовы фонд прэзідэнта пазычае грошы бюджэту Беларусі?

У апошнія дні рэзервовы прэзідэнцкі фонд стаў усплываць у навінах усё часцей. Спачатку высветлілася, што прэзідэнт як быццам бы зрабіў жэст добрай волі і вырашыў кампенсаваць дэфіцыт сродкаў у бюджэце са свайго фонду — 2,9 мільярда даляраў. Выдаткі бюджэту мелася скараціць на 20%, але зменшыліся толькі на 5%. Усё б выглядала насамрэч прыгожа, калі б не той факт, што ў выдатках новага бюджэту адлічэнні ў той самы рэзервовы фонд павялічыліся на 2,9 мільярда даляраў! Грошы будуць узятыя з рэзервовага фонду, але потым вернутыя туды назад. Фармальна бюджэт амаль не змяніўся, фактычна зменшыліся расходы на ахову здароўя (на 100 мільёнаў даляраў), адукацыю (на 120 мільёнаў) і сацыяльную палітыку (на 522 мільёны).

Пасля ж было заяўлена, што менавіта з рэзервовага прэзідэнцкага фонду будзе аплачаны ўнёсак Беларусі ў антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС. Дзесяць мільёнаў даляраў для дзяржавы не надта вялікія грошы, але Лукашэнка вырашыў не абцяжарваць бюджэт нават гэтай сумай, а расплаціцца са свайго асабістага фонду.

Што такое рэзервовы фонд, з чаго ён складаецца і колькі ў ім грошай — пытанне з пытанняў беларускай эканомікі. Яшчэ ў канцы 1990-х незалежныя эканамісты вылічвалі, што ў ім знаходзілася каля 11 мільярдаў даляраў. З яго выплачваюцца стыпендыі адоранай моладзі, адзін час з яго фінансаваўся Беларускі патрыятычны саюз моладзі, перадвеснік БРСМ. Фонд не рэгулюецца заканадаўствам, ён існаваў ізалявана ад іншых дзяржаўных грошай і толькі зараз пачаў у нечым перакрыжоўвацца з бюджэтам.

**ЯМ**

## Даляры ў абмен на намеры

Міжнародны валютны фонд выдзеліў Беларусі дадатковы мільярд даляраў.

Беларускія ўлады дамовіліся з Міжнародным валютным фондам наконт выдачы краіне другой часткі грошай. Больш за тое, сума крэдыту будзе павялічаная — з $2,46 мільярдаў да $3,46 мільярдаў. Місія МВФ, якая прыязджала ў Мінск, у цэлым станоўча ацаніла дзеянні беларускіх фінансістаў. Яны выконваюць рэкамендацыі —тарыфная стаўка не расце, а значыцца, і заробкі не падымаюцца.

З дыпламатычных крыніцаў у Мінску нам стала вядома, што ўзамен за дадатковы мільярд даляраў Беларусь мае зрабіць новыя крокі ў прыватызацыі. Аднак дамоўленасці не абавязваючыя, МВФ задаволіўся «намерамі».

**ЯМ**

## Рубель на мяжы

Вось ужо тыдзень курс беларускага рубля ў адносінах да валютнага кошыка знаходзіцца каля верхняй мяжы адведзенага на гэты год 5% калідора. У аўторак кошт валютнага кошыка склаў 1007,84 рубля. Выхадныя ён быў амаль такім самым — 1007,83 рубля. Мяжа, за якую Нацбанк абяцаў не выходзіць, — 1 008 рублёў.

Пераацэнены, па меркаванні спецыялістаў, еўра стаў апускацца ніжэй, а вось даляр, наадварот, падымаецца.

За апошнія 9 месяцаў курс беларускага рубля да даляра знізіўся на 32%.

**ЯМ**

## Замежны доўг Беларусі пераваліў за $16 млрд

Сукупны замежны доўг Беларусі за першы квартал 2009 году вырас на 1170,7 млн даляраў (7,7%) і на 1 красавіка склаў $16322,4 млн, паведамляе Белстат.

Характэрна, што Белстат перагледзеў у большы бок рост замежнае запазычанасці за мінулы год: у 2008 годзе яна вырасла не на $2324,4 млн (18,6%), як паведамлялася раней, а на $2658,2 млн (21,3%). Такім чынам, на 1 студзеня яе памер складаў $15151,7 млн, а не $14817.9 млн, як раней паведамляла статыстыка.

У тым ліку замежны дзяржаўны доўг дасягнуў памеру $4100,4 млн.

З улікам ужо закантрактаваных новых пазыкаў сукупны замежны доўг на канец 2009 году, імаверна, перавысіць 20 млрд даляраў, або 28% ад ВУП. Для гаспадаркі тыпу беларускай бяспечная мяжа сукупнае замежнае запазычанасці знаходзіцца ў раёне каля 50% ад ВУП, дзяржаўнае — каля 25% ад ВУП. Нягледзячы на актыўнае запазычванне, беларуская эканоміка яшчэ не трапіла ў трывожную зону.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Дапамога шматдзетным сем'ям

Стаўка за карыстанне льготнымі крэдытамі на жыллёвае будаўніцтва для шматдзетных сем'яў зніжаная з 3% да 1% гадавых.

### Рост інфляцыі замарудзіўся

Паводле інфармацыі Белстату, інфляцыя ў Беларусі ў траўні склала 0,3%, агулам за год — 6,9%.

### 578 даляраў у кожнага

Уклады насельніцтва Беларусі складаюць 15,81 трыльёнаў рублёў (5,59 мільярдаў даляраў). У сярэднім кожны беларус трымае на рахунках 578 даляраў у пераліку.

### Менш кантролю за цэнамі

З 1 ліпеня цэны на паслугі пральняў, хімчыстак, цырульняў не будуць рэгулявацца дзяржавай. Таксама са спісу сацыяльна значных тавараў і паслуг выкідаюцца стэрылізаванае, топленае і казінае малако, здоба, абаранкавыя і сухарныя вырабы, пірагі, піражкі, пончыкі.

### Нацбанк: стабільнасць рубля будзе

«Стабільнасць ў валютнай сферы захаваецца», — адказаў першы намеснік кіраўніка Нацбанку Павел Калавур на пытанне дэпутатаў, ці будзе дэвальвацыя.

### Арэндная плата ў рублях

У Мінску арэндную плату «адвяжуць» ад еўра. Базавая стаўка квадратнага метра цяпер будзе складаць 17500 рублёў.

### Ліда і Крычаў — найлепшыя для бізнэсу

Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў правёў даследаванне, высвятляючы самыя лепшыя беларускія гарады для вядзення бізнэсу. Імі прызнаныя Ліда і Крычаў.

**ЯМ**

# Ці лёгка Крамлю скінуць Лукашэнку?

**Крэмль закусіў губу. «Выглядае на тое, што некаму проста надакучыла быць прэзідэнтам гэтай краіны», — злавесна заявіла крыніца ў атачэнні Мядзведзева. Каментуе Аляксандр Класкоўскі.**

Гэта адбылося пасля таго, як Лукашэнка байкатаваў саміт АДКБ і даў зразумець, што гатовы паставіць пагранцоў ды мытнікаў на расійскай мяжы.

У ролі Касандры традыцыйна выступае «КоммерсантЪ». Падтэкст заявы крамлёўскага ананіма болей чым празрысты. З яго вынікае, што памяняць фігуру на чале нашай краіны крамлёўцам як раз плюнуць.

Але ці сапраўды так? Ці сапраўды Крэмль здольны скінуць Лукашэнку адной левай? Нарэшце, наколькі расійская кіроўная эліта ў гэтым зацікаўленая?

Лукашэнка ж яшчэ для Пуціна стаў косткай у горле. Аднак узяць ППРБ ні голымі рукамі, ні ў яжовых рукавіцах так і не пашэнціла.

Спробы стварыць у нас нейкую прарасійскую пятую калону за ўвесь постсавецкі час не прынеслі бачнага плёну. Усе адпаведныя грамадска-палітычныя структуры былі маргінальнымі і ціха завялі. Моцнага прарасійскага кандыдата на выбарах таксама вылучыць не атрымалася. Ды і якія тут, к чорту, выбары?



Варыянты нейкай спецаперацыі ці палацавага перавароту таксама малаімаверныя (чаму — асобная тэма).

Пусціць танкі, як на Тбілісі? Але ж перад гэтым трэба зрабіць сепаратысцкі анклаў з якога-небудзь там Шклоўскага раёну. Не, і гэты сцэнар не коціць.

Дык як жа тады, кажучы па-крамлёўску, «мачыць у сарціры»?

Застаецца эканамічная душылаўка. Той самы «КоммерсантЪ» ужо прадракае газавую вайну. Але ж гэта бумеранг. Тым болей на фоне цяперашняга альянсу Мінску з Кіевам. Ды і Еўропа на дыбкі ўздымецца.

Дарэчы, менавіта еўрапейскі, заходні чыннік зараз выглядае выратавальным. Захад мог бы нават адкласці выхаваўчыя размовы і проста дапамагчы ўтрымаць незалежнасць. Але унікальны гістарычны шанец на рэзкае збліжэнне з Еўропай — не для гэтага палітычнага рэжыму. Персаналісцкай, антыдэмакратычнай сістэме няма чаго лавіць у садружнасці Старога Свету. Хаця гульня на еўрапейскім чынніку зараз, канечне, актывізуецца.

Разам з тым, найболей імаверным выглядае варыянт, што пасля абмену ўдарамі адбудзецца нейкае ўлагоджванне стасункаў з Расіяй. Там спрацуюць традыцыйныя вялікадзяржаўныя фобіі. Прычым страшна страціць не толькі РЛС пад Ганцавічамі, аб'ект пад Вілейкай, увогуле, увесь гэты стратэгічны «беларускі балкон». Мусіць, найстрашней, што іншы ўрад сапраўды возьме курс на Еўропу.

Яшчэ і таму Расіі нявыгадна абвальваць беларускую эканоміку.

Так што пасля фазы вайны чакайма нейкіх узаемных саступак, нейкага варыянту замірэння. І зноў будзе поціск рук з крывымі ўсмешкамі ды поўнымі нянавісці поглядамі.

# Масква слязам не верыць

**Уражанне, што Крэмль «мяса–малочную істэрыку» пралічваў. Развязка доўгачасовай гульні на лініі Масква–Мінск–Брусэль ужо недалёка. Піша Андрэй Пачобут.**

Аляксандр Лукашэнка так і не здолеў напужаць Расію. Спачатку ультыматум — не паеду на саміт АДКБ, калі не пусціце малако на ваш рынак, — былі агучаны кулуарна, але ніякага ўражання на Крэмль ён не зрабіў.

У суботу адбылася публічная гістэрыка ў выглядзе загаду свайму атачэнню: ідзіце званіце ў Расію і «душыце на расійцаў». Макей, Жадобін і Мартынаў



распачалі серыю бязглуздых тэлефонных размоваў з сваімі расійскімі адпаведнікамі.

Усё гэта агучвалі дзяржСМІ.

БТ нават адмыслова перарывала праграму, каб суровым дыктарскім голасам паведаміць гледачам пра гэтыя размовы.

Потым у эфіры з'явіўся самаабвешчаны прэс-сакратар амбасады Кітая ў Мінску і цяпер ужо ад імя Беларусі рашуча асудзіў імперскасць Расіі. [Маецца на ўвазе кіраўнік лукашэнкаўскага сацыялагічнага агенцтва «ЭкаОМ» Сяргей Мусіенка. — Рэд.]

Вынік — нуль.

Тады запрашаюцца ў Міністэрства замежных справаў усе акрэдытаваныя ў Мінску амбасадары краінаў-удзельніц АДКБ. Яны таксама атрымоўваюць сваю порцыю плачу і трызнення...

Вынік — нуль.

Нягледзячы на ўсе гэтыя інфармацыйныя выбухі, ніякіх саступак не адбылося.

І ППРБ засталося толькі выканаць абяцанне і збайкатаваць саміт.

Уражанне, што Крэмль гэты крок пралічваў. Прынамсі, пакуль так выглядае.

Інструментаў для барацьбы з Расіяй у Лукашэнкі няшмат. Фактычна, акрамя працягу публічных істэрык і расповедаў ідэалагічных баек, разлічаных на чырвоных імперыялістаў, засталося толькі вайсковае супрацоўніцтва. Ну, можна яшчэ нейкія дробныя уколы рабіць расійскай гаспадарцы, але гэта сабе даражэй.

Карацей, цікавы момант.

Развязка доўгачасовай гульні на лініі Масква-Мінск-Брусэль, здаецца, ужо недалёка. Прынамсі, сябраваць і з тымі, і з тымі для Лукашэнкі ўсё складаней.

# Трэці лішні

**Малочная вайна — вынік лукашэнкаўскіх спробаў сутыкнуць Пуціна і Мядзведзева, мяркуе Віталь Тарас.**

Незадоўга да падзеяў вакол маскоўскага саміту АДКБ некаторыя расійскія палітолагі выказвалі думку, што Аляксандр Лукашэнка гуляе ў разрэз паміж Пуціным і Мядзведзевым — спрабуе, так бы мовіць, разбурыць «тандэмакратыю». Што ж, калі перад тым расійскі прэм'ер Пуцін і міністр фінансаў Кудрын сапраўды гулялі ў Мінску ў добрага і злога следчых, як пра тое многія пісалі, чаму б Лукашэнку было не згуляць у тую ж самую гульню? Толькі паводле сваіх правілаў і з больш высокімі стаўкамі.

Прэзідэнту Мядзведзеву ў гэтай гульні адводзіцца роля «добрага хлопца», а Пуціну — «кепскага». Нездарма ж Лукашэнка запрашаў Мядзведзева на 65-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Праўда, як лічаць некаторыя палітолагі, гульня ў кіраўніка РБ не ўдалася, бо прэзідэнт РФ адназначна выступіў у абарону Кудрына, а пасля дэмаршу беларускіх уладаў у адносінах да АДКБ выказаў асабістую крыўду на Лукашэнку. Але гэта гледзячы пра якую гульню весці размову. Як даў



зразумець ён сам, гульня пайшла па-буйному. І не ў добрага і злога следчых, але, хутчэй, у «трэці лішні».

Калі задумацца, цяперашні беларуска-расійскі канфлікт дэстабілізуе сітуацыю не столькі ў Беларусі, колькі ў Расіі. У Беларусі ўлада кансалідаваная. А ў Расіі апошнім часам мы назіраем на фоне эканамічнага крызісу ўсё больш заўтую барацьбу «тандэмакратаў» паміж сабой за ўладу. Напрыклад, выязное пасяджэнне Рады бяспекі пад старшынствам Мядзведзева ў Дагестане стала беспрэцэдэнтнай падзеяй. Прэзідэнт, фактычна, упершыню зайшоў на «каўказскую тэрыторыю», якая заўсёды лічылася «тэрыторыяй» Пуціна і яго сілавікоў. Пуцін жа ў сваіх інтэрв'ю ўсё больш яўна крытыкуе палітыку свайго былога стаўленніка.

Крызіс у адносінах з галоўным і, бадай, апошнім хаўруснікам на постсавецкай прасторы фактычна азначае ўнутрыпалітычны крызіс Расіі. Нехта за яго павінен адказаць. (Як казаў некалі Беразоўскі — «за казла адкажаш»). На ролю «ахвярнага казла» цалкам падышоў бы галоўны санлекар РФ Аніўчанка, на якога лёгка можна зваліць выдаткі «малочнай вайны». Але гаворка цяпер ужо не толькі пра эканамічны крызіс.

Стаўкі, наколькі можна зразумець з апошніх падзеяў, сапраўды ўзляцелі вельмі высокія. І трэцім лішнім у рызыкоўнай гульні можа быць прызначаны адзін з кіраўнікоў Расіі, а можа — кіраўнік саюзнай дзяржавы. Калі тандэмакраты хоць бы з пачуцця самазахавання дамовяцца паміж сабой дзейнічаць супраць упартага суседа сумесна, не выбіраючы сродкаў і метадаў псіхалагічнай дый не толькі псіхалагічнай вайны.

Цяжка прагназаваць вынікі гульні, якая вядзецца пад коўдрай, ды яшчэ без правілаў. Ясна адно — партыя ўваходзіць у стадыю эндшпілю, і хутка мы пабачым развязку. Шкада толькі, што беларусы, як заўсёды, застаюцца ў ролі маўклівых гледачоў.

# Купляў бы, каб грошы

**Чарговае падзенне цэнаў на сталічнае жытло на аўкцыёне.**

На чарговы аўкцыён былі выстаўленыя 32 кватэры ў панэльным доме. Пачатковы кошт метра склаў 890 даляраў, і пры гэтай цане не знайшлося пакупнікоў на 5 трохпакаёвых кватэраў, а з 4-пакаёвак прыдбалі гаспадароў толькі 3 кватэры.

Сярэдні кошт метра ў двухпакаёўках склаў 1055 даляраў (на 172 даляры танней, чым на папярэднім аўкцыёне). Выклаўшы ад 54,5 да 59,7 тысячаў даляраў, пакупнікі набывалі кватэры агульнай плошчай 55 метраў.

Кошт метра ў прададзеных трохпакаёўках склаў яшчэ менш — 945 даляраў. Выніковы кошт кватэраў агульнай плошчай 70–75 квадратаў вагаўся ад 66 да 75 тысячаў даляраў.

**МБ**

# Каўчэг — на старт!

Ліе і ліе ў Беларусі, лічы, ужо месяц. Вада стаіць ва ўсіх нізах. Вось і з пятніцы да нядзелі зноў выпала з палову месячнай нормы ападкаў. У Чачэрску — 48 мм, або 48 літраў вады на квадратны метр тэрыторыі (58% ад месячнай нормы), Гомелі — 45 мм (57%), Васілевічах — 43 мм (54%), Мінску — 40 мм (49%).

Паводле звестак гідраметцэнтру, сярэднясутачная тэмпература паветра 14 чэрвеня аказалася на 3—5°С ніжэйшай за кліматычную норму.

Сапраўднае лета яшчэ не блізка. Сіноптыкі прагназуюць, што дажджыстае надвор'е захаваецца яшчэ з тыдзень, а мо і дзён дзесяць. Праўда, стане цяплей — да 20—25 градусаў.

**АГ**



**Нягледзячы на залеву, традыцыйная каталіцкая працэсія на ўрачыстасць Божага Цела ў Гродне сабрала тысячы чалавек. Такія шэсці каталікі ладзяць ва ўсім свеце.**

# Часовы начальнік сталіцы

Аляксандр Лукашэнка прызначыў першым намеснікам старшыні гарвыканкаму і выканаўцам абавязкаў кіраўніка гораду Мікалая Ладуцьку. Хворы Міхаіл Паўлаў вызвалены з пасады. Мікалай Ладуцька нарадзіўся ў 1959 годзе ў Мінску. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці «інжынер-будаўнік». Пачынаў працаваць у будаўнічым упраўленні №256 МАПІД «Мінскжылбуд». Быў першым намеснікам сакратара Фрунзенскага райкому ЛКСМБ, намеснікам загадчыка аддзелу камсамольскіх арганізацый ЦК ЛКСМБ, інструктарам арганізацыйнага аддзелу Фрунзенскага райкому КПБ.

З 1990 па 2003 г. — адзін з кіраўнікоў будтрэсту МАПІД. У 2003 годзе быў прызначаны дырэктарам камунальнага унітарнага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкаму». У 2006 годзе Мікалай Ладуцька ўзначаліў Фрунзенскі раён сталіцы, а літаральна праз год быў пераведзены ў намеснікі да старшыні Мінгарвыканкаму Міхаіла Паўлава.

**Зміцер Панкавец**



# Жанчыны напісалі Пан Гі Муну

**Бо шаснаццаць зваротаў да Лукашэнкі былі без толку.**

11 чэрвеня 2009 г. група жанчынаў — сваячак асуджаных, а таксама нязгодных з рашэннямі судоў, прыйшлі на сустрэчу з генпракурорам Рыгорам Васілевічам. Яны збіраліся перадаць яму калектыўны зварот з просьбай разгледзець па сутнасці іх скаргі. Генпракурор не выйшаў да жанчынаў, і яны звярнуліся да прэсы. Па словах юрыста Тамары Сяргей, нядаўна жанчыны пачалі атрымліваць адказы з Адміністрацыі прэзідэнта, куды яны звярталіся з просьбай паўплываць на хаду іх справаў у судах. «І вось мы маем 77 копій тых адказаў, якія адрозніваюцца толькі адрасамі людзей, якім яны былі дасланыя. Усім адказалі абсалютна аднолькава, незалежна ад таго, у каго якая справа была», —распавяла Т. Сяргей. Сярод жанчынаў, напрыклад, Галіна Юбко з Мінску, якая ад 2004 году шукае праўды пра акалічнасці смерці сваёй сястры, Вера Макарэвіч з Салігорску, якая не верыць, што яе сын наклаў на сябе рукі.

Атрымаўшы такія адказы, жанчыны звярнуліся да аўтарытэтных міжнародных арганізацый. Яны напісалі да генеральнага сакратара ААН Пан Гі Муна, генсакратара Рады Еўропы Тэры Дэвіса, еўракамісара па замежнай палітыцы Беніты Ферэры-Вальднэр і дырэктара Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ Янэза Ленарчыча. У звароце гаворыцца, што ўсе спробы вырашыць праблемы ўдзельнікаў групы, у тым ліку з дапамогай зваротаў да кіраўніка дзяржавы (а ўсяго іх было 16), скончыліся нічым. «Вось чаму мы звяртаемся да Вас з просьбай давесці нашы праблемы да беларускіх уладаў і спадзяёмся, што ў Вас гэта атрымаецца лепш, чым у нас. А мы будзем адстойваць свае правы з надзеяй на падтрымку міжнароднай супольнасці», — гаворыцца ў звароце. Яго падпісалі 170 чалавек з усёй Беларусі.

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Кляшчы атакуюць Дразды

У Мінску знойдзена восем ачагоў пражывання кляшчоў. Яны выяўленыя ў лясных масівах Сляпянкі, Сцяпянкі, Уручча, а таксама ля вадасховішчаў Заслаўскае, Крыніца, Дразды, Цянянскае. Пасяліліся яны і ў раёне пасёлку Сосны.

Іксадовыя кляшчы пераносяць небяспечныя захворванні — хваробу Лайма і кляшчовы энцэфаліт. Калі клешч трапіў на скуру, можна яго дастаць самому ці звярнуцца ў паліклініку, але ў любым разе рэшткі кляшча варта аддаць на даследаванне ў Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Калі клешч быў інфікаваны, дактары прызначаць лячэнне.

### Смяротны ўкус ката

У Клімавіцкім раёне 34-гадовы мужчына памёр у бальніцы. Экспертыза паказала, што прычынай смерці быў параліч у выніку заражэння шаленствам ад укусу ката.

### Хацелася феерверку

10 чэрвеня у кватэры маладзечанца адбыўся выбух. Узарваўся самаробны феерверк. Яго рыхтаваў сабе на дзень нараджэння 22-гадовы мужчына. Яму адарвала тры пальцы на левай руцэ.

### У праваслаўных Пятроўскі пост

Ён прадоўжыцца да 12 ліпеня — дня Пятра і Паўла. Пятроўскі пост лічыцца нястрогім. У любы дзень, апроч серады і пятніцы, можна есці рыбу. Пра Пятроўскі пост казалі: «Пятроўка — галадоўка», бо да новага ўраджаю было яшчэ далёка, а ад мінулага ўжо нічога не засталося.

### Справа Снегіра ў судзе

Генпракуратура накіравала ў суд справу былога пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра. Ён быў зняты з пасады, абвінавачаны ў хабарніцтве, злоўжыванні службовым становішчам і захоўванні боепрыпасаў ды арыштаваны неўзабаве пасля антыкарупцыйнай нарады з удзелам А.Лукашэнкі. Матэрыялы справы Снегіра склалі 38 тамоў.

**Паводле «Рэгіянальнай газеты», радыё «Свабода», БелаПАН**

# Вік: Расія будзе будаваць АЭС у Беларусі 25 гадоў

**І так і не дабудуе, бо зацягванне будоўлі будзе ў яе інтарэсе.**

Ганс-Георг Вік, нямецкі дыпламат, былы кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі: «У 1974 годзе «Siemens» выйграў тэндэр на пабудову АЭС у Іране — я акурат тады быў паслом Нямеччыны ў гэтай краіне — яны пачалі будоўлю і за чатыры гады станцыю амаль збудавалі. Пасля Ісламскай рэвалюцыі Хамейні нямецкую кампанію выгнаў. А ў 1984 годзе зноў запрасіў назад.



Немцы абдумалі — і адмовіліся.

Тады Хамейні запрасіў будаваць Савецкі Саюз. СССР пагадзіўся. І дагэтуль будуе. І канца той будоўлі не відаць. Таму што гэта ў іхнім інтарэсе — расцягнуць гэтую будоўлю да бясконцасці. Тое самае будзе, калі Расія пачне будаваць АЭС у Беларусі».

Такое меркаванне Г-Г.Вік выказаў у часе дыскусіі «Прыкметы пераменаў у Беларусі: ацэнка апошніх падзеяў у Беларусі і вакол яе», што адбылася 10 чэрвеня пад эгідай Нямецкага Фонду Маршала ў Берліне.

На дыскусіі прысутнічалі два дыпламаты з беларускага пасольства ў Нямеччыне, але яны не бралі слова.

**Барыс Тумар, Берлін**

## ЦЫТАТЫ

### Пазняк: Машэраў — найбольшы цемрашал у Беларусі

[У саветаў быў] «план аб знішчэнні ... неперспектыўных вёсак, гэта была большая частка вёсак, а дакладна, з 34 тысяч беларускіх вёсак пакідалі толькі 9 тысяч. Такім планам займаўся найбольшы цемрашал у Беларусі Пётр Машэраў».

### Мухі і катлеты па-партнёрску

Райнэр Лінднэр, старшыня Нямецка-беларускага таварыства і Мінскага форуму: «Ёсць супярэчнасць у тым, як успрымаюць праграму «Усходняе партнёрства» ў Еўрасаюзе і Беларусі. Для ЕС «Усходняе партнёрства» — гэта перадусім палітыка, а для Беларусі — эканоміка.

### Блохі вы!

«Не забіваюць — пастаў, няхай суткамі кідаюць, каб забівалі. Поўзаеце, як блохі, па пляцоўцы».

Старшыня Беларускай федэрацыі гандболу Уладзімір Канаплёў на прэс-канферэнцыі, каментуючы выступленне нацыянальнай каманды ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы-2010.

# Вярніце мову

Працяг са старонкі 1.

Аўтары звароту просяць палаты нацыянальнага сходу весці заканатворчую дзейнасць на беларускай мове. «І яшчэ, калі пойдзе на добры лад: ці не палічылі б Вы за свой гонар прыняць дапаўненне да Закона аб дзяржаўнай службе, унёсшы ў яго патрабаванне, каб усе дзяржаўныя служачыя ведалі абедзве дзяржаўныя мовы, як гэта мае месца ва ўсіх краінах».

У частцы звароту, скіраванай не да Лукашэнкі, а да ягоных падначаленых, тон становіцца вастрэйшы: «Сяргей Сяргеевіч [Сідорскі], пагадзіцеся, што ацэнка экспертамі ЮНЕСКА стану нашай мовы з'яўляецца прысудам ураду і кіруючым уладам краіны на розных узроўнях. То ці не наспеў час прыняць стратэгічна важныя для краіны і нацыі рашэнні аб сістэмнай беларускамоўнай адукацыі і пераўтварэнні ў бліжэйшы час пакуль хоць аднаго з універсітэтаў у нацыянальны па духу і мове навучання альбо адкрыцці новага паўнавартаснага беларускага універсітэту? Вам, напэўна, вядома, што кіраўнікі Мінадукацыі не бачаць неабходнасці ў сістэмнай беларускамоўнай асвеце. ... Такі ход падзей задавальняе міністэрскіх касмапалітаў і русіфікатараў, пры якіх, дарэчы, моцна ўпаў прэстыж запалоханага, загнанага безліччу справаздачных папер настаўніка; але ж беларускаму ўраду ў падобным выпадку зробіць гонар іншая, па-сапраўднаму нацыянальная палітыка.

Як на нашу думку, наспеў час вярнуць значна скарочаныя гадзіны на выкладанне беларускай гісторыі, мовы і літаратуры, аднавіць практыку большага матэрыяльнага заахвочвання настаўнікаў роднай мовы і літаратуры».

У звароце называецца «трагікамічным» «становішча, калі адзін з высокіх чыноўнікаў супакойвае грамадзян такім чынам: «Не бойцеся, беларуская мова не знікне, бо мы заўважылі тэндэнцыю. Чым больш прыціскаем, тым больш жадаючых вучыцца па-беларуску!»

Шмат у звароце і пустых клішэ: «І ёсць нямала прыкладаў, калі разам з мовай знікае нацыя і дзяржава». Аднак жа, аўтары наўрад ці дадуць хоць адзін прыклад, калі спачатку знікла мова, а пасля — дзяржава і тым больш — нацыя. Або: «Беларусь з'яўляецца адзінай у свеце краінай, якая не мае вышэйшай адукацыі на мове тытульнай нацыі», — аўтары звароту не ведаюць прыкладаў за межамі Цэнтральнай Еўропы. Так, у нашай частцы Еўропы — няма, а вось на землях амерыканскіх індзейцаў — спрэс.

Ёсць і двухсэнсоўныя расшаркванні: «Прыняты ў 2008 годзе Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» засведчыў пра клопат некаторых уладных установаў аб функцыянаванні роднай мовы, але ён будзе нічога не варты, калі дзяржава і ўсе грамадзяне не спыняць працэс свядомай дэбеларусізацыі жыцця».

Аўтары звароту мяркуюць: «Ад рашэння пазначаных тут пытанняў ... выйгралі б усе ... і выйграў бы кіраўнік незалежнай краіны, з прыходам якога да ўлады па нейкім дзіўным непаразуменні пачаўся новы этап дыскрымінацыі беларускай мовы, багаты склад якой, годнасць і прыгажосць прызнаны далёка ў свеце.

На нашай ... зямлі адвыклі ад клопату пра свае нацыянальныя каштоўнасці ... — на тое былі пэўныя і зусім няпростыя гістарычныя прычыны, — народ сам сабе не належаў. Але ж цяпер дазвольце спадзявацца, што наш Зварот знойдзе водгук у вашых сэрцах і душах».

Як бы ні спрэчны нам быў тэкст звароту, але пісаўся і падпісваўся ён яўна ад сэрца. Звярнула ўвагу, як многа падпісала яго людзей з акадэмічных колаў і дзяржаўных выданняў, ніяк не звязаных з незалежным грамадствам. Мова з'яднала. Масавасць жа звароту надалі шматлікія подпісы студэнтаў. Гэта пры тым што тэкст перад апублікаваннем цыркуляваў толькі ў вузкіх сталічных асяродках. У Рэдакцыі «НН» яго да публікацыі не бачылі. Тэкст падпісалі:

**Пятро Нікіценка**, эканаміст, акадэмік НАН Беларусі, **Іван Гайшун**, матэматык, акадэмік НАН Беларусі, **Яўген Бабосаў**, філосаф, акадэмік НАН Беларусі, **Радзім Гарэцкі**, геолаг, акадэмік НАН Беларусі, **Генадзь Лыч**, эканаміст, акадэмік НАН Беларусі, **Аляксандр Вайтовіч**, фізік, акадэмік, экс-прэзідэнт НАН, экс-старшыня савету рэспублікі, **Міхаіл Касцюк**, акадэмік НАН Беларусі, **Міхаіл Дрынеўскі**, Народны артыст Беларусі, кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага Народнага хору імя І.Цітовіча, прафесар, **Леанід Яўменаў**, доктар філасофскіх навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, **Міхаіл Казінец**, Народны артыст Беларусі, прафесар, **Валянціна Гаявая**, Народная артыстка Беларусі, **Аляксандр Булыка**, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар у галіне мовазнаўства, **Міхась Мушынскі**, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар, **Уладзімір Шакуцін**, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання былых вязняў фашызму «Лёс», **Георгій Штыхаў**, доктар гістарычных навук, прафесар, **Мікалай Крукоўскі**, доктар філасофскіх навук, прафесар, **Захар Шыбека**, доктар гістарычных навук, **Васіль Бернік**, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, **Сцяпан Лаўшук**, доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН, прафесар, **Уладзімір Гніламёдаў**, пісьменнік, доктар філалагічных навук, акадэмік, **Леў Гумілеўскі**, Народны мастак Беларусі, скульптар, **Васіль Шаранговіч**, Народны мастак Беларусі, прафесар, **Віктар Скорабагатаў**, мастацкі кіраўнік творчага калектыву «Беларуская Капэла», **Уладзімір Конан**, доктар філасофскіх навук, **Арлен Кашкурэвіч**, Народны мастак Беларусі, **Уладзімір Стальмашонак**, Народны мастак Беларусі, **Леанід Шчамялёў**, Народны мастак Беларусі, **Зінаіда Бандарэнка**, Народная артыстка Беларусі, **Рыгор Барадулін**, Народны паэт Беларусі, **Ядвіга Грыгаровіч**, доктарка педагагічных навук, прафесарка, **Міхась Міцкевіч**, доктар тэхнічных навук, **Эдуард Збароўскі**, доктар медыцынскіх навук, прафесар, **Арсень Ліс**, доктар філалагічных навук, **Уладзімір Гілеп**, былы намеснік міністра культуры, **Васіль Коўшар**, аграном, кандыдат сельскагаспадарчых навук, **Генадзь Бураўкін**, паэт, дыпламат, **Валеры Мазынскі**, тэатральны дзеяч, рэжысёр, **Васіль Якавенка**, пісьменнік, **Анатоль Казлоў**, пісьменнік, **Раіса Баравікова**, пісьменніца, **Алег Трусаў**, старшыня Таварыства беларускай мовы, **Таццяна Кім**, інжынер, **Віталь Міклашэўскі**, інжынер, **Мікола Бамбіза**, эканаміст, **Міхаіл Малько**, фізік, **Мікалай Савіцкі**, прафесар інфарматыкі, **Аляксей Рагуля**, прафесар культуралогіі, **Яўген Сахута**, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, **Станіслаў Лісоўскі**, інжынер, **Надзея Малаковіч**, настаўніца, **Уладзімір Якімовіч**, вадзіцель, **Аляксей Фралоў**, музыкант, **Аляксандра Руская**, выхавацелька дзіцячага саду, **Яраслаў Мальдзіс**, дызайнер, **Ілья Копыл**, пенсіянер, **Лета Юстыновіч**, пенсіянерка, **Сафія Дземідовіч**, бібліятэкарка, **Іван Макавецкі**, кандыдат тэхнічных навук, **Ала Крыцкая**, доктарка-стаматолаг, **Ларыса Шаўчэнка**, інжынер, **Уладзімір Джэйгалс**, інжынер, **Сяргей Занкевіч**, бухгалтар, **Надзея Мініна**, студэнтка, **Уладзімір Азёма**, інжынер, **Васіль Касінец**, афіцэр запасу, **Алег Шагулін**, радыёінжынер, **Яўген Рамяніца**, студэнт, **Ян Квяцінскі**, студэнт, **Ганна Вус**, студэнтка, **Марына Шацінская**, студэнтка, **Яўген Ганязоўскі**, студэнт, **Віктар Сянько**, рабочы, **Павал Севярынец**, **Юрый Карэтнікаў**, **Сяргей Салаш**, **Антон Астаповіч**, **Людміла Карэтнікава**, інжынер НВА «Інтэграл», **Андрэй Паротнікаў**, юрыст, **Ягор Купа**, студэнт, **Дзмітрый Міцкевіч**, студэнт, **Алесь Шарафановіч**, інжынер, **Ігар Чапіга**, студэнт, **Кастусь Краўчанка**, чыгуначнік, **Наталля Апаровіч**, студэнтка, **Сяргей Марцулевіч**, студэнт, **Таццяна Кузьміч**, студэнтка, **Аляксандр Кундра**, студэнт, **Алена Кузьміч**, студэнтка, **Юрый Акінчыц**, службовец, **Алена Гайко**, студэнтка, **Ірына Фурман**, студэнтка, **Юрый Макарэвіч**, студэнт, **Ірына Уласавец**, студэнтка, **Вольга Дуброўка**, студэнтка, **Наталля Урбан**, студэнтка, **Вольга Уласавец**, цырульніца, **Андрэй Беліч**, студэнт, **Ірына Лысова**, студэнтка, **Святлана Кударэнка**, студэнтка, **Іна Казлоўская**, студэнтка, **Вольга Ясюкевіч**, студэнтка, **Ірына Гудойць**, студэнтка, **Вераніка Навіцкая**, студэнтка, **Юлія Мазай**, студэнтка, **Віктар Казлоў**, электразваршчык, **Юрый Губарэвіч**, намеснік старшыні Руху за Свабоду, **Ларыса Сімаковіч**, кампазітарка, **Валянціна Лемцюгова**, доктар філалагічных навук, прафесарка, **Алег Залётнеў**, кампазітар, **Алесь Лозка**, старшыня Таварыства беларускай школы, **Аляксандр Талстыка**, прадпрымальнік, **Аляксандр Макаеў**, прадпрымальнік, **Ігар Свіркоў**, начальнік цэху, **Эдуард Сарока**, доктар філасофскіх навук, **Святлана Снапкоўская**, доктарка гістарычных навук, прафесарка, **Георгій Латушка**, протаіерэй, настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскага сабору ў Мінску, **Сергій Гардун**, протаіерэй, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, **Леанід Левін**, архітэктар, Заслужаны архітэктар Беларусі, **Ірына Бохан**, юрыстка, **Галіна Дзягілева**, артыстка, **Дзмітры Бабіцкі**, эканаміст, **Алег Гаеўскі**, інжынер-электронік, **Павал Біч**, кандыдат тэхнічных навук, **Уладзіслаў Абухоўскі**, геадэзіст ды іншыя — усяго 203 подпісы.

Кантакты: (029) 776-77-13, yakavenka@list.ru — Васіль Якавенка




**Грамадзянская кампанія «Будзьма!» папулярызуе мову новымі метадамі.**

### Доля беларускай мовы на ЦТ падае

На яе зарэгістраваліся 37% ад супольнай колькасці тых, хто здае мовы, проці 39% летась і 42% два гады таму.

15 чэрвеня ў Беларусі пачалося цэнтралізаванае тэставанне — агульнанацыянальная праверка ведаў. Па яго выніках можна будзе паступаць у ВНУ. Яно працягнецца па 1 ліпеня.

Найбольшая колькасць абітурыентаў, як і ў папярэднія гады, запісалася на экзамен па матэматыцы: 116 тысяч чалавек.

На цэнтралізаванае тэставанне па фізіцы выдадзена крыху больш за 52 тысячы пропускаў, на біялогію — 33 тысячы, хімію — каля 19,7 тысячы. На замежныя мовы зарэгістравалася прыблізна 40 тысяч чалавек, на гісторыю Беларусі — больш як 26 тысяч, геаграфію — 2,5 тысячы, грамадазнаўства — 12,5 тысячы, сусветную гісторыю — 2,4 тысячы.

Звяртае ўвагу выразны вынік лукашэнкаўскай русіфікацыі: сёлета працягвала змяншацца колькасць выпускнікоў, якія здаюць беларускую мову. На экзамены па расійскай мове зарэгістраваліся 110 тысяч чалавек, па беларускай — 65 тысяч (37% ад супольнай колькасці тых, хто здае мовы).

Для параўнання: у 2008 годзе на беларускую мову зарэгістравалася 69 тыс. чалавек (39%), на расійскую — 107 тыс. абітурыентаў. У 2007 годзе тэставанне па беларускай мове прайшлі 82 тыс. чалавек (42%), расійскую здавалі 113 тыс. чалавек.

Зрух складае 2—3% за год. Ён, бадай, адпавядае зніжэнню долі людзей, якія аддаюць пэўную перавагу беларускай мове перад расійскай з утылітарных ці сімвалічных прычынаў. Гэта сапраўдная бяда для нацыі. Толькі энергічныя змены ў моўнай палітыцы, статусе моваў і іх прысутнасці ў інфармацыйнай прасторы могуць змяніць сітуацыю.

**Мікола Бугай**




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

# Па той бок Вялікай малочнай сцяны

**Журналіст «НН» Алесь Кудрыцкі наведаў Смаленск у пошуках беларускага малака.**

Сучасныя расіяне называюць Смаленск сваім заходнім шчытом. Аднак сёння горад бароніць абшары РФ ад даволі незвычайнага ворага — беларускага малака. Змаганне не абяцае быць лёгкім — за апошнія гады Смаленшчына ператварылася ў сапраўдны бастыён беларускай малочнай прадукцыі, якая заняла трывалыя пазіцыі на паліцах мясцовых крамаў.

Журналісты «НН» наведалі Смаленск 12 чэрвеня, акурат на Дзень Расіі. Раз-пораз у цэнтры места можна было сустрэць дзяцей з расійскімі сцяжкамі ў руках ды аўтамабілі са стужкамі-трыкалорамі, прымацаванымі да антэнаў. Са сцяны будынку ў цэнтры гораду пра свята інфармаваў вялізны банер з выявай сабора Васіля Блажэннага ды двухгаловага арла. Прыгледзеўшыся да банера ўважлівей, можна было заўважыць, што знізу да яго прыляпілася рэклама смаленскага гандлёвага дому «Белшына». Сапраўды, беларуская прысутнасць тут хоць і ненавязлівая, але паўсюдная. То на фірмовую краму абутку «Марка» натрапіш, то на шыльду «Беларускі трыкатаж».

На Заднепроўскім рынку лёгка знаходзім кіёск, пазначаны надпісам «Беларусь». Тут спецыялізуюцца на беларускіх малочных вырабах — аднак аніводнага пакунку з надпісам «зроблена ў Беларусі» ў кіёску ўжо не адшукаць: прадалі, а на замену беларускаму закупілі расійскі тавар. Што думаюць пакупнікі пра знікненне беларускага малака? Як выяўляецца, іх не асабліва цікавіць, дзе насамрэч тое малако выраблюяць: «Я ўсё запар набываю, — кажа бабуля ў хустцы, якая выходзіць з кіёску. — Гляджу, абы таннейшае». Мужчына сярэдняга веку з ёй салідарны: «Я так, неяк, прыйшоў, што ёсць, тое і ўзяў. Я не гляджу на краіну-вытворцу».

Заходзім у першую-лепшую буйную краму на вуліцы Вялікай Савецкай (транспартнай магістралі, якая праходзіць праз стары горад). Тут, сярод стракатых пакункаў расійскіх малочных брэндаў, мы заўважаем знаёмыя поліэтыленавыя цэбрыкі з тварагом «Савушкін прадукт». Відавочна, гэта рэшта асартыменту беларускіх малочных вырабаў.

Крочым далей. У скверыку ў цэнтры гораду мы заходзім у пакрыты бляхай кіёск з надпісам «Малако. Яйка. Сыр. Хлеб». Тут прадаюць збольшага малочныя прадукты расійскай маркі «Летні дзень» — аднолькавыя кардонныя пакецікі, якія адрозніваюцца адзін ад аднога хіба што колерам ды назвамі. «Беларускія малочныя прадукты? Прадаваліся ў нас, канечне! Вось ужо з учора нічога не завозяць, — кажа прадавачка. — Бралі іх з ахвотай. Цэны былі, у прынцыпе, аднолькавыя з расійскімі. Мы бралі на рэалізацыю малако, кефір, масла». Ці былі б уладальнікі кіёску задаволеныя, калі б беларускай прадукцыі дазволілі вярнуцца на паліцы? «Ну канечне, канечне! Чаму? Ну дык пакупнікі любяць такую прадукцыю беларускую!»

Распытваемся ў мінакоў, ці набываюць яны беларускую прадукцыю і што думаюць пра «малочнае эмбарга». Першыя нашыя суразмоўцы — жанчына ў цёмных акулярах ды летняй сукенцы з дачкой гадоў чатырнаццаці. Завіталі ў Смаленск на выходныя, жывуць у Курску. Як выяўляецца, нават там яны набывалі беларускія малочныя прадукты: «Цана задавальняла, якасць». «Забарона — гэта дрэнна, нерэальна», — кажа жанчына. «Неразумна», — пацiскае плячыма дачка. «Мы прыехалі ў Смаленск, і гэтая навіна нас проста шакавала», — дадае яе маці.

**Беларускія малочныя прадукты хвалілі ўсе, з кім мы размаўлялі на вуліцах Смаленску.**

Наступнымі нам сустракаюцца доўгавалосы хлопец і дзяўчына ў чырвонай цішотцы: «Здаецца так, у краме «Лаваш» у нас прадаецца «малочка» беларуская», — кажа дзяўчына. Чаму набывалі? «Таму што ў краме даступныя цэны, а там толькі беларуская прадукцыя», — кажа яна. «Ды дзе там, няпраўда», — пярэчыць ёй хлопец. «А вось і праўда. Ты ёгурты там набываў, менавіта беларускія», — не згаджаецца тая. «Якая розніца, — фыркае хлопец. — Там і смаленскія дзве фірмы ёсць». «Ну добра, ёсць і смаленскія», — здаецца дзяўчына, для якой гэтая праява мясцовага эканамічнага патрыятызму з боку сябра відавочна зрабілася неспадзяванкай. Пытаемся: а што вы пра забарону думаеце? «Ды я, увогуле, пра яе не думаю, — кажа хлопец. — Нам без розніцы». «Зрэшты так», — усміхаецца сяброўка.

А вось яшчэ адна маладая пара, абодвум крыху больш за дваццаць гадоў. «Мы супраць гэтай забароны, адразу скажам», — сходу запэўнівае дзяўчына. Спрабуем справакаваць іх пытаннем: дык, можа, і сапраўды ёсць нешта такое ў беларускіх прадуктах, з-за чаго варта было б забараніць іх увоз? «Ды не, проста гэта палітыка», — упэўнена кажа дзяўчына.

Падыходзім да іншай, даволі буйной крамы ў ажыўленым цэнтры, якая належыць мясцоваму прадпрымальніку. Прадавачка старанна раскладае ў вітрыне-лядоўні ўсялякія малочныя ласункі. Прыглядаемся і дзівуемся: прадукцыя — спрэс беларуская! І не толькі малочныя прадукты, але і мясныя. Такому багатаму асартыменту магла б пазайздросціць любая мінская крама — тавары прывезеныя з самых розных рэгіёнаў Беларусі, многія з іх у сталіцы і не пабачыш. Мы запытваемся: чаму ў вас прапануецца так шмат беларускага? «Гэта ўжо толькі рэшта, — прыязна адказвае прадавачка. — Як бачыце, беларускую ўжо замяняе нашая прадукцыя». Як выяўляецца, крама адмыслова спецыялізуецца на прадуктах з заходняй краіны-суседкі і ўжо мае сталае кола кліентаў, якія кіруюцца слоганам «набывайце беларускае». Чаму так? «Таму што карыстаецца попытам. Пакупнікі кажуць, што беларуская прадукцыя смачнейшая, больш якасная. Па цане прымальная. Абмежаванне на ўвоз малака для крамы нявыгаднае, бо пакупнікі прызвычаіліся да беларускай прадукцыі», — тлумачыць жанчына. Што будзеце рабіць, калі абмежаванне будзе працягвацца? «Будзем прадаваць нашую прадукцыю, расійскую! — смяецца прадавачка. — Іншай альтэрнатывы няма».

А вось і наведніца крамы — як выяўляецца, сталая кліентка. «Я заўжды набываю беларускую прадукцыю, — кажа кабета. — Мне яна больш падабаецца, вось і ўсё. Мне здаецца, яна больш натуральная. Я лічу, няправільна зрабілі, што забаранілі».

Пахадзіўшы па смаленскіх крамах, разумееш, што расійскі ўрад нанёс сапраўды балючы ўдар па беларускіх вытворцах. Прысутнасць беларускай прадукцыі тут відавочная. І праблема не толькі ў тым, што беларускія малаказаводы згубяць летнюю расійскую выручку. Сваё месца на расійскім рынку беларуская малочная прамысловасць заваёўвала не адзін год, а тут цалкам згубіла яго за нейкі тыдзень. Назіраецца небяспечная тэндэнцыя: расійскія крамы масава пачалі замяняць беларускую прадукцыю айчыннай, нявязваць сувязі з новымі, мясцовымі пастаўшчыкамі. Нават калі Крэмль неўзабаве здыме сваё «малочнае эмбарга», ніхто не гарантуе, што былыя гандлёвыя сувязі адновяцца ў тым самым аб'ёме.

Здавалася б, ход Крамля — пратэкцыянісцкі, аднак папулярным яго не назавеш. Прынамсі, захаплення сярод апытаных намі жыхароў Смаленску ён не выклікаў. Ад забароны на беларускі малочны экспарт пацярпелі і расійскія спажыўцы (паменеў выбар), і расійскія прадуктовыя крамы, значную частку асартыменту якіх складалі беларускія тавары. Бадай, зачэпленыя яшчэ і інтарэсы транспартных фірмаў, якія перавозілі тавары з Беларусі, ды і ці мала каго яшчэ. Хоць расійская малочная прамысловасць, натуральна, будзе ў плюсе.

Але вось парадокс: беларускія малочныя прадукты хвалілі амаль усе, з кім мы размаўлялі на вуліцах Смаленску, і ў той жа час ніхто так і не здолеў сказаць уцямна, за што іх упадабаў. Але — набываюць! Многія расійскія пакупнікі ўпарта лічаць нашыя ёгурты, сыры ды тварог «больш натуральнымі» за айчынныя. Станоўчы імідж шматпакутных беларускіх малочных прадуктаў застаецца па-партызанску нязломным.

# Бардэль імя Гогаля на літоўскай мяжы

Рэпартаж **Паўла Касцюкевіча** з найбольшага ў нашай частцы Еўропы музычнага фестывалю пад адкрытым небам Be2gether.

### Эціс, аціс, Нарвілішкіс

Лета мала. Пра гэта ведалі на вялікім канцэрце на вольным паветры Bela-Music-2009 пад Мінскам, пра гэта здагадаліся на беларуска-літоўскім памежжы ў Нарвілішках на вялізным оўпэн-эйры Be2gether. І таму, захапіўшы плашчы і парасоны, масава прыехалі на канцэрт. Паводле арганізатара фестывалю Гедруса Клімкявічуса, у пятніцу, першы дзень фэсту, паслухаць музыку прыбыло шэсць тысячаў чалавек, у тым ліку тысячы дзве з Беларусі.

Be2gether стаўся жывым увасабленнем сучаснай моладзевай культуры, дзе адначасова і на роўных правах пануе шмат розных кірункаў. На адной сцэне можна было пачуць рок, на другой — трансавыя рытмы і яшчэ рэп, фолк і джаз. Акрамя ці замест музыкі, можна было пакаштаваць масажу ці ёгі, паглядзець фільм на гіганцкім экране і купіць як сувенір старыя добрыя аўдыёкасеты BASF (якія чамусьці прадаваліся ў намёце, расфарбаваным вясёлкавымі, сэксменшынёвымі, колерамі). Анансаванае качанне ў гразюцы і катанне на прыбытых да сцэны роварах давяршылі карціну ўсеагульнага культурнага плюралізму.

Нават цэлафанавыя плашчы ад дажджу тут насілі паводле музычных прэферэнцыяў: у жоўтых і чырвоных імпэтна білі дол аматары кіслотнай танцавальнай музыкі, шанавальнікі фолку і нью-эйджу адухоўлена моклі збольшага ў празрыстых плашчах, а аб(с)кураныя рокеры стаічна танчылі без накідак.

### Зоркі і «Зорачкі»

Пад суцэльнай завісcю дажджу дыхту даваў фаварыт цёткі Мадонны — Gogol Bordello. Нават рэч не ў тым, што мегазорка ў бардэльшчыкаў ходзіць у прадусарах: як заяўляе лідэр гурту Яўгеній Гудзь, ён «сам з вусам». А таму было неймавернае шоу: цыганска-эквадорска-расійскія танцы пад акардэон і скрыпачку. Каб самавыказацца, экзатычны ансамбль песні і скокаў выкарыстаў усё: і пазалочанае самбрэра, і растаманскае пончa, накінутае на самога Яўгенія, і ці то мазахісцкую, ці то баксёрскую маску на твар, і нават бел-чырвона-белы сцяг, выкінуты на сцэну і ўмела падхоплены другім салістам, Педрам Эразам. І таму зухаваты паўторак, звернуты да ананімнай Віялеты: Start wearing purple / «Давай, апранай пурпуровае!» гучаў, як кпіны — ну, куды яшчэ і пурпур паўзверх усяго гэтага?!

У пятніцу быў вечар адкрыццяў. Усе прызнаваліся ў любові да гэтага рэгіёну Еўропы. Хіп-хопер Майкл Перэта, вядомы пад мянушкай Evidence, з Dilated people нават прагаварыўся, што мама яго паходзіць з-пад Мінску і што ён сам, нягледзячы на імідж злоснага рэпера, не ездзіць на джыпе (канфіскавалі за няcплату штрафаў). Прыгаданы вышэй Яўгеній Гудзь, лідэр «Бардэлю імя Гогаля», у сваім эксклюзіўным інтэрв'ю беларускім журналістам (якое ён, як усякі стоадсоткавы цыган, даў за барнай стойкай), прызнаўся, што за сваю бадзяча-даўжэзную кар'еру быў таксама ў Мінску ў 1989, калі ехаў на канцэрт гурту «Аліса». А на пытанне: «Беларусь — гэта добра ці кепска?», адказаў: «Беларусь — гэта «Дынама» (Мінск)!».

У суботу выступаў «Ляпіс Трубяцкой». Вось тут стала зразумела, што заяўленыя дзве тысячы беларусаў даехалі да канцэрту. На песні «Зорачкі» журналісты налічылі да 25-ці бел-чырвона-белых сцягоў (літоўская паліцыя і ўдзельнікі канцэрту свае лічбы не падалі). «Ляпісы» былі спрэсаваныя, пазбаўленыя сопляў і «зяленаглазатаксічных» шлягераў, рок-кілеры. «Ведаеце, мне падабаецца мастацтва, якое сканчаецца бойкай, закалотам, — сказаў пасля канцэрту Сяргей Міхалок. — А што Бона? Так, колішнія песні, але ж цяпер ён — сябар прэзідэнтаў, аўкцыёны, нейкія сацыяльныя прамовы».


Пратэжэ Мадоны Яўгеній Гудзь.
Уладзь Грыдзін


Юлія Ружачка
«Ляпіс Трубяцкой» даў жару.

### Планы на будучыню (недалёкую)

Сёлета нас чакаюць яшчэ Фэст электроннай музыкі Global Gathering — 27 чэрвеня (Баравая, Мінск) і фестываль маладой беларускай музыкі «Басовішча» — 17 і 18 ліпеня (Гарадок, Польшча).

Фестываль Be2gether робіцца пазнавальным: ужо з'явіліся саколкі, дзе падаюцца адметныя расшыфроўкі літары B з назвы:

Babye2gether (зробім разам дзіцятка)

Beere2gether (пап'ем разам піва)

# Абрабаваная кватэра дырэктаркі «Белсату»



У Варшаве разгромленая і абкрадзеная кватэра дырэктара тэлеканалу «Белсат» Агнешкі Рамашэўскай.

«14 чэрвеня Агнешка з мужам вярнуліся з водпуску і засталі ў кватэры разгром, — паведаміў кіраўнік службы інфармацыі «Белсату» Аляксей Дзікавіцкі. — Усё было перакуленае: паліцы, шафы. Ва унітазе ляжалі нейкія дакументы. У кватэры нельга было нават пераначаваць».

Паводле словаў А.Дзікавіцкага, замок быў ускрыты адмычкай, у кватэры адсутнічаюць адбіткі пальцаў, з каштоўных рэчаў зніклі толькі тры залатыя ланцужкі і некалькі срэбных пярсцёнкаў. «Апрача таго, майка, якая вісела ў шафе з надпісам на англійскай мове аб небяспецы журналісцкай прафесіі, была раскладзеная на крэсле. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што ў кватэры пабывалі не зусім звычайныя злодзеі. Паліцэйскія заявілі, што працавалі прафесіяналы», — сказаў супрацоўнік «Белсату».

Сама А.Рамашэўская не выключае, што ў пранікненні ў кватэру замяшаныя беларускія спецслужбы.

«Гэта вельмі непрыемнае пачуццё, нібыта табе кажуць: «Бачым цябе, сочым за табою, можам увайсці ў тваю кватэру». Магчыма, разлічвалі на эфект запалохвання, бо няма доказаў, што гэта было проста ўварванне з крадзяжом», — цытуе дырэктара «Белсату» сайт каналу.

**БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Затрыманы Валянцін Дандорф

Супрацоўнікі Камітэту дзяржаўнай бяспекі затрымалі брэсцкага бізнэсмэна Валянціна Дандорфа. Як паведаміў Цэнтр інфармацыі і грамадскіх сувязей КДБ, яму выстаўленае абвінавачанне ў стварэнні злачыннай арганізацыі і кіраванні ёю (ч. 1 арт. 285 КК), ілжэпрадпрымальніцтве (ч. 2 арт. 234 КК). Бізнэсмэн змешчаны ў СІЗА УКДБ па Брэсцкай вобласці. Спыненая супрацьпраўная дзейнасць 14 камерцыйных структур, падкантрольных Дандорфу. У памяшканнях швейных фірм і жылых дамах, якія належаць бізнэсмэну, у тайніках было знойдзена звыш 100 км тканіны і больш як 16 тыс. гатовых швейных вырабаў коштам звыш 2 млрд рублёў без дакументаў, якія б пацвярджалі легальнасць іх набыцця або вырабу.

### Меры бяспекі на Дзень вызвалення

Усім, хто пажадае трапіць на святочныя мерапрыемствы 3 і 4 ліпеня ў Мінску, давядзецца прайсці праз стацыянарныя металадэтэктары. Грамадзяне ў стане алкагольнага ап'янення і з алкагольнымі напоямі дапускацца туды не будуць, паведамляюць у міліцыі. Перад правядзеннем мерапрыемстваў пляцоўкі абследуюць спецыялісты-выбуховатэхнікі са службовымі сабакамі. Затым міліцыя возьме пляцоўкі пад ахову. Усё, што будзе адбывацца падчас мерапрыемстваў, будзе здымацца на відэа.

### Амаль 36 тыс. хворых на свіны грып

Колькасць лабараторна пацверджаных выпадкаў захворванняў на вірус грыпу A/H1N1 дасягнула 35 928 чалавек. Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, вірус зарэгістраваны ў 76 краінах, памерлі 163 пацыенты. Найбольшая колькасць выпадкаў захворванняў: ЗША — 17 855 чалавек; Мексіка — 6241; Канада — 2978; Аўстралія — 1823; Чылі — 1694; Вялікабрытанія — 1226; Японія — 605; Іспанія — 488; Аргенціна — 343; Панама — 272.

**Паводле БелаПАН, радыё «Свабода»**



# Аднесеныя Нёманам

«Хам» у пастаноўцы Гарцуева нагадвае галівудскую эпапею.

Спектакль паводле аповесці Элізы Ажэшкі «Хам» больш нагадвае «Аднесеныя ветрам» ці нядаўнюю «Аўстралію» з Ніколь Кідман. Доказы? Тут і вечна меладрамны сюжэт: гісторыя кахання жанчыны, якой гэты свет — замалы, зацесны. І музычнае аздабленне класічнага серыяльнага кампазітара Марка Бертрамі. Зусім галівудская ўсмешка Святланы Зелянкоўскай, што ўвасабляе галоўную гераіню, Франку. Спецэфектны дым і закадравае шматгалоссе. А яшчэ: пастаноўка, якая цвеліць, хай сабе і патроху, ці не ўсе нервовыя шляхі мінскага гледача: тут і дакорыстае нагадванне пра нацыянальнае самавызначэнне, і не менш пякучае, хоць і больш схаванае, пытанне любові. Эпапея, дзе спалучаюцца і меладрама, і камедыя, і сацыяльная крытыка. Усяго патроху — і склалася паліфанічнасць гучання: пэўна, каб кожны абраў, што яму даспадобы.

«Хам, хамы!» — чарговы раз прамаўляе напаўшляхцючка Франка на адрас свайго мужа Паўла і ягонай крэўні. І адразу ўсё — не раўнуючы, як у айчыннай гісторыі апошніх стагоддзяў — актывізуецца, паўтараецца нанова: канфлікт, высвятленне адносінаў і чарговы віток жарсцяў. «Хам» — выносіць у загаловак сама Ажэшка і ці не адным словам уцягвае чытача і гледача ў вір беларускай і чалавечай праблематыкі.

Дзякуючы купалаўцам, Ажэшка паўстае як мама беларускай масавай культуры. Новых берагоў не адкрывалі, але ж... Нёман! Якая дыхтоўная метафара чалавечага жыцця з яго быстрынямі і смяротнымі вірамі, зацішнымі тонямі і палкім палаводдзем.

Сапраўдны, але нешчаслівы мужык; прыгажэнная жанчына, якая за тую пекнату і церпіць, — такія гісторыі не прымушаюць задумацца, хутчэй спытаць, ці спадабалася? Так, спадабалася — сапраўды прафесійна выбудаваны сюжэт і таленавітая ігра акцёраў.

Чаго бракавала? Тэатральнасці (якая як зваротна прапарцыйная функцыя ад кіношнасці). Спроба паказаць шматлікія аблічча жыцця часта ўпінаецца ў шматдумна-банальнае: «Век звекаваць — не пальцам паківаць». Яшчэ адна гераіня, добрая вядзьмарка Яўдоха, нібы ўчуўшы гэтую плыткасць, самаіранізуе: «Кепскіх людзей не бывае, бываюць сапсутыя». Кепскіх эпапей не бывае, бываюць нецікавыя. Было цікава — тым, хто любіць справаздачы жыцця.

**Гэта не першая пастаноўка «Хама». У далёкім 1921, на золку беларускага тэатру, на сцэне БДТ-1 адбылася прэм'ера «Хама». Дадамо, што на адкрыцці Беларускага тэатру гледачам быў прадстаўлены таксама спектакль «Рысь», паводле твораў Ажэшкі, у пастаноўцы Фларыяна Ждановіча.**

### Размазаная гісторыя пра т. зв. каханне ці актуальны спектакль?

(Палеміка вакол пастаноўкі «Хам» на сайце nn.by):

**Глядач:** Пастаноўка нагадвае амерыканскую меладраму... Галоўны герой, напрыклад, амаль увесь час апрануты у свой рыбацкі плашч: і за сталом, і ў абдымках Франкі. Неяк гэта не натуральна. Атрымаўся такі сабе прынёманскі каўбой.

**Mikola:** Aktualny spektakl jak na siońniašni čas. Adna nazva čaho vartaja! A chto krainaj kiruje? Ne adhadali — nie Lukašenka! Chamstva kiruje...

**S.Rusiecki:** Спектакль варта залічыць да няўдач тэатру. Не разумею прычынаў, па якіх спектакль быў прыняты да пастаноўкі. Цяжка сабе ўявіць больш няўдзячны матэрыял — абсалютна наіўная, дэбютная проза, пазбаўленая і каліва драматургічных прыкмет, настолькі нецікавая, размазаная гісторыя пра т.зв. каханне, выказаная прымітыўнымі маралізатарскімі словамі Ажэшкі, укладзенымі ў вусны пабожных (?) беларускіх сялян-католікаў...

Пры гэтым варта адзначыць, што акторы задзейнічаныя не абы-якія, і іх проста шкада — яны павінны граць гэты прымітыў.

**Ustyna:** А чаму б, уласна кажучы, не Ажэшка? Хіба не актуальнае сёння супрацьстаўленне боскага і д'ябальскага пачатку ў чалавеку? Хіба не актуальная тэма ратавання чалавечай душы? Няхай будзе Ажэшка для некага прымітыўная. А для некага – трапяткая, якая прымушае разважаць пра грэх, пра тое, чым і як яго можна перамагчы. А то ў нашай вельмі хрысціянскай краіне ў тэатры амаль нічога няма пра вечнае змаганне за чалавечыя душы.



# Навагрудскія ўлады заклікаюць ахвяраваць на помнік Міндоўгу

Сабраная пятая частка ад неабходнай сумы.

Мемарыял Міндоўгу мусіў паўстаць сёлета ў сувязі з святкаваннем тысячагоддзя Літвы і 965-годдзя Навагрудку. Аднак, як паведамілі «НН» у навагрудскім райвыканкаме, у часе святочных мерапрыемстваў 10—11 чэрвеня помнік першаму каралю Літвы не быў усталяваны. Не адбыўся і традыцыйны фестываль сярэднявечнай культуры «Наваградскі замак», які святкуюць ад 2000 г., і які сёлета планавалі спалучыць з Днём гораду. «Не хапіла сродкаў на рыцарскі турнір», — кажа начальнік аддзелу культуры райвыканкаму Аляксандр Карачан. Па яго словах, на помнік Міндоўгу назбіралі прыблізна пятую частку ад неабходнай сумы. А ўсяго трэба каля 400 мільёнаў рублёў. Частку грошай вылучылі з гарадскога бюджэту, свой унёсак зрабілі мясцовыя прадпрыемствы і фірмы. «Але трэба разумець, што перад гарадскімі ўладамі стаяць і іншыя задачы — добраўпарадкаванне вуліц гораду, рамонт дарог, таму мы будзем толькі рады, калі кожны ахвочы ахвяруе на стварэнне помніка», — патлумачыў А.Карачан.

Ён прывёў прыклад з гісторыі гораду, калі ў 1920—1930-я месцічы ўласнымі высілкамі стварылі помнік знакамітаму земляку — насыпалі курган у гонар Адама Міцкевіча. І дадаў: «Мы можам аднавіць гэтую слаўную традыцыю і стварыць сапраўдны народны помнік».

Сродкі можна пералічыць на разліковы рахунак: «Аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама, 231400, г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 9а, р/р 3632000001310 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 698, УНП 500031377, ОКПО 02234044, дзейнічае на падставе Палажэння. На выраб помніка Міндоўгу».

**Сямён Печанко**

# Сінія цэрквы

Здзітава—Жабінка—Збірагі. На радзіме Касцюшкі захавалася некалькі шэдэўраў драўлянага дойлідства. Піша **Сяргей Харэўскі**.


Царкве ў Здзітаве будавалася яшчэ пры каралю Аляксандру. Ёй больш за 500 гадоў, і яна захавалася некранутаю!

Беларусь падала на ўключэнне ў Спіс усясветнае спадчыны ЮНЭСКА драўляныя цэрквы Палесся. Там ацалелі ўнікальныя храмы, некаторым з якіх па чатырыста і болей гадоў. То скіруемся ад Мінску па брэсцкай шашы, каб паглядзець гэтыя перліны нашае спадчыны.

У Спісе ЮНЭСКА драўляным дойлідствам прадстаўленыя таксама Нарвегія і Японія. Клімат і рупнасць нарвежцаў здолелі захаваць у тым суровым краі так званыя «стаўкіркі» — бажніцы XII—XIV стст. Гэткіх цэркваў калісь было ў Нарвегіі 750, а ацалела толькі 30. У Японіі ж захавалася драўляная бажніца ажно 690 году: храм Харудзі ў Нара. На ўвесь свет вядомыя і паморскія цэрквы расійскае Поўначы, што ў архітэктурным запаведніку ў Кіжах. Некалькі музеяў драўлянага дойлідства ёсць у Заходняй Украіне, дзе таксама зберaглося багата падобных помнікаў. Што ж маем мы?

Дарога тым часам ідзе па Кобрыншчыне. За вёскай Пяскі з брэсцкай шашы варта збочыць на Чаравачыцы. За паваротам пакажацца спрацаваны, салідны Мухавец, а за мостам ужо і вялікая вёска. Тут была старадаўняя драўляная царква Святой Параскевы. Пры канцы 1970-х яна згарэла дашчэнту. Зараз на яе месцы ўзвялі груваcткую мураваную царкву Святога Іаана Багаслова, з шэрагу такіх, архітэктар якіх невядомы... Хоць той, хто будаваў, імкнуўся падкрэсліць падабенства гэтае царквы да храму ў недалёкай Чыжэўшчыне, па іншы бок трасы.

Там манументальная Уладзімірская царква была пастаўленая пры канцы XIX ст. у гонар стогадовага юбілею бою паміж касцюшкоўцамі і расійцамі пад Крупчыцамі...

Наогул, на Жабінкаўшчыне багата памяткак пра часы Касцюшкі. Стаіць помнік Тадэвушу Касцюшку перад школаю ў Малых Сяхновічах. Бюст героя двух кантынентаў быў выраблены ў 1930-я вядомай скульптаркай А.Відацкай для Кобрына. Але ў 1939 г. яго адтуль прыбралі, а ў 1988 г. усталявалі ў Малых Сяхновічах. У самой школе ёсць музейчык, што распавядае пра колішняга гаспадара тутэйшых ваколіц. І тут, і ў Вялікіх Сяхновічах, і пад Чыжэўшчынай распавядаюць, што вось гэтыя акурат прысады пасадзіў сам генерал Касцюшка...

Але спачатку, едучы ўздоўж маляўнічых берагоў Мухаўца, праз вёску Залуззе, можна патрапіць у Здзітаў. Дарэчы, у Залуззі ёсць цікавы этнаграфічны музей «Вясковая хата»: побыт і традыцыйны лад палешукоў. Для тых, хто раней не бываў у гэтых краях — сапраўдная экзотыка. Поўдзень, роўнядзь мухавецкіх разлогаў, вялікая кукуруза і буйныя сланечнікі...

## Здзітава

Здзітава — адна з самых старажытных вёсак у Беларусі. Здзітаўская царква Мікіты вядомая з 1502 г. Так і стаіць гэты храм над Мухаўцом дасёння ў засені старадаўніх дрэваў. Мікітаўская царква ёсць найбольш старажытным помнікам драўлянага дойлідства ўсёй Беларусі. Невялікі храм узведзены ў самых архаічных нашых традыцыях з драўляных брусоў на мураваным падмурку. Такога кшталту зрубавыя канструкцыі, сведчаць археолагі, існавалі яшчэ за паўтысячы гадоў да нашае эры.

Царква Мікіты ў Здзітаве — тыповы беларускі адназрубавы храм: прастакутны зруб з невялікім прырубам-тамбурам на галоўным фасадзе. Усё разам пакрытае агульным высокім дахам. Раней ён быў гонтавы, а цяпер рэжа вока новай бляхаю. На даху — невысокая макаўка на гранёнай шыйцы. Проста і ясна.

Яе тры разы капітальна рамантавалі — у 1787, у 1850-я і ў 1929 г. Але паўтысячагадовыя падмурак, каркас, сама канструкцыя ацалелі. І ўсярэдзіне гэтая царква робіць незабыўнае ўражанне. Царская брама іканстасу скразной драўлянай разьбы, старажытныя абразы. Адсюль у Мінск, у Музей старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук, была вывезеная ў свой час «Адзігітрыя Ерусалімская» XVI ст. Гэты абраз — шэдэўр старажытнабеларускага іканапісу.

Крыху наводдаль стаіць каржакаватая званіца, таксама архаічнай каркаснай канструкцыі. Кароткія слупы па вуглах трымаюць чатырохкутны шацёр даху. Абок Мікітаўскае царквы захаваліся нават дубовыя прысады старадаўняга парку. Званіца і царква разам гарманічна пераходзяць у натуральны краявід, знітаваны з імі ў адно цэлае.

Здзітава не падобнае да вёсак у Цэнтральнай Беларусі. Усе ваколіцы тут скультураныя ўшчэнт. Ані дрыгвы, ані дрымучасці. І ў гэтай цывілізаванасці ёсць сваё рэдкае харство. Спыніцца ў Здзітаве можна ў турыстычнай аграсядзібе, што месціцца ў процілеглым ад царквы канцы сяла, над пляжам на Мухаўцы, па адрасе...

## Жабінка

Жабінка — мілае мястэчка на ростанях усіх дарог. Яна ўтварылася знянацку, як і, напрыклад, Баранавічы, у 1871 г., калі тут прайшла Маскоўска-Брэсцкая чыгунка. Да таго на сутоку рэчкі Жабінкі з Мухаўцом быў тузін вёсак і фальваркаў: Абрамавічы, Галінова, Купіна, Мышчыцы Пакроўскія... У Жабінцы ёсць шыкоўная драўляная царква Пакрова Прасвятое Багародзіцы, пабудаваная ў 1885 г.

У горадзе захавалася нямала будынкаў міжваеннага часу: шыкоўны вакзал, старая вуліца Касцюшкі (сёння, як і паўсюль, Леніна), вадацяжная вежа, старыя могілкі, стары парк...

Але сёння ўсё жыццё ў Жабінцы круціцца вакол цукровага заводу — найбуйнейшага ў краіне. Ёсць і рэстаран, і бары, і вельмі прыстойны гатэль.

## Збірагі

Праз пасёлак цукровага заводу дарога прывядзе вас проста ў Збірагі, у Брэсцкі раён. У Збірагах ацалеў яшчэ адзін старажытны драўляны храм — Пятніцкая царква. Невялікую святыню фундавала княгіня Агата Сапега з Пацаў яшчэ ў 1610 годзе. То бок, на лета будзем адзначаць яе чатырохсотгоддзе. Царква цудоўна захавалася і выдатна дагледжаная, трэба аддаць належнае густу тутэйшага настаяцеля. У сярэднявеччы, зазвычай, аснову будынку, ніжні вянок зрубу, прамежкавыя шулы сценаў, апорныя слупы, а таксама парогі, вушакі і ваканіцы рабілі з дубу. Трывушчасць дубу даказалі стагоддзі. Вось і маем. Простаму і саліднаму храму выдатна пасуе такая ж каржакаватая, але манументальная званіца, як і ў Здзітаве.

Пятніцкая царква паспела пабыць храмам усіх канфесій. Два з паловай стагоддзі была ўніяцкай, пасля праваслаўнай, у 1921 г. Пятніцкі храм стаў касцёлам. Па вайне храм зноў аддалі праваслаўным... Але храм не пуставаў ніколі. Мо таму і ацалеў. Ёсць у ім і своя рэліквія — часцінка мошчаў прападобнае Марыі Егіпецкай у абразе... Штогод 14 красавіка тут ладзяцца фэсты на дзень яе памяці. А раней Збірагі славіліся Траецкімі фэстамі, на якія збіраліся тлумы пілігрымаў да фігуры Хрыста. Але ў 1945 г. яе вывезлі ў Тэрэспаль, у Польшчу...

Пашпацыраваць у ваколіцах Збірагаў — задавальненне. Пашукаць жалудоў ці паўднёвых духмяных кветак.

Адно ў Збірагах пакуль ані кавярні, ані гатэлю няма. Таму есці і спыняцца можна ў Брэсце, да якога тут рукой падаць.

**Агратурыстычная сядзіба ў Здзітаве**

у якой можна спыніцца, месціцца на маляўнічым беразе Мухаўца на вуліцы Рачной, 7. Кантакт: тэл.: +375–1641–24–398, 28–438.

**Здзітава**

(Здзітаў, Здзітаўцы, на мясцовай гаворцы — Здытово) — адна з самых старажытных вёсак у Беларусі. Ёсць меркаванне, што яе назва яцвяжскага паходжання. У дзяржаўных дакументах ВКЛ Здзітава згадваецца рэгулярна пачынаючы з XVI ст. Большая частка населеных пунктаў сучаснай Жабінкаўшчыны ў тыя часы насіла назву Здзітавец. Напрыклад, існавалі вёскі і маёнткі Мацеевічы–Здзітавец, Федзькавічы–Здзітавец, Пятровічы–Здзітавец, Здзітавец–Шалухі. Дарэчы, і тутэйшы маёнтак пад гэтай вёскаю належыў да XIX ст. Касцюшкам...

У міжваенныя гады ў Здзітаве пабудавалі народную школу, народны дом, каталіцкую капліцу. Ва ўсім тым царкоўным прыходзе ў 1935 жыло 1295 праваслаўных, 60 рыма–каталікоў, 10 баптыстаў, нямала юдэяў.


Шыкоўная царква ў Жабінцы.

# Хто аўтар «Пінскай шляхты» ?

**Толькі, напэўна, не Дунін-Марцінкевіч. Мовазнаўцы Мячкоўская і Клімчук, гісторык Ільін пакрысе набліжаюцца да раскрыцця загадкі. Піша Алег Дзярновіч.**

Фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» лічыцца найвыдатнейшым творам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. У адрозненне ад многіх класічных твораў, гэты і за паўтара стагоддзя не састарэў. Кручкатворства, хабарніцтва, страх перад чыноўнікам дагэтуль прысутнічаюць у навакольнай рэчаіснасці. Не дзіва, што спектакль Купалаўскага тэатру паводле п'есы такі папулярны. Акторы нават дазваляюць сабе гаварыць з пазнавальнымі інтанацыямі сённяшніх, усім вядомых персанажаў.

## Два рукапісы з куфра пана Вінцэнта

Між тым сам Дунін-Марцінкевіч ніколі не называў «Пінскую шляхту» ўласнай п'есай. Дый згадвае яе толькі раз. У 1868 г. у лісце да этнографа Яна Карловіча ён упамінае рукапіс «Пінскай шляхты», які вязе нехта Вішнеўскі.

Наступная прыгадка сустракаецца ўжо ў некралогу па Марцінкевічу, што з'явіўся ў газеце «Край» у 1885 г. Там, са спасылкай на бібліёграфа Аляксандра Ельскага, указвалася, што сярод рукапісаў засталася «Пінская шляхта» па-беларуску.

Ельскі ведаў пра яго, бо адразу па смерці Марцінкевіча ездзіў у Люцінку ды меў магчымасць забраць з легендарнага куфра пана Вінцэнта яго рукапісы. Менавіта асобнік са збораў Ельскага трапіў пасля да гісторыка Мітрафана Доўнар-Запольскага, выдаўца «Календара Паўночна-Заходняга краю» на 1889 і 1890 гг. Доўнар-Запольскі хацеў апублікаваць у ім і п'есу. Згодна з парадкам, звярнуўся па дазвол да цэнзуры. На запыт да віленскага генерал-губернатара аб мэтазгоднасці публікацыі фарс-вадэвілю «на пінскай гаворцы» генерал-лейтэнант Каханаў адказаў наступнае: «Падобны твор, у якім у непрыглядным выглядзе выстаўляецца персона службовай асобы, станавога прыстава, які да таго ж паўсюль называецца «найяснейшая карона», наўрад ці дарэчы змяшчаць у якім-небудзь выданні, а асабліва ў такім, як каляндар, які прызначаецца для распаўсюду ў асяроддзі мясцовага насельніцтва». Дзе потым дзеўся рукапіс — нямаведама.

Але існаваў і другі. Яго ў 1887 г. дачка Дуніна-Марцінкевіча Каміла даслала Яну Карловічу. Пасля смерці Карловіча ён трапіў у Віленскі гістарычны архіў.

## Суаўтар — Купала

Паводле таго рукапісу і была зробленая першая публікацыя твору. Мала хто ведае, што памятным са школы «як унадзіцца юрыста — вымеце хату дачыста» і іншым досціпам «Пінскай шляхты» надаваў літаратурнае гучанне Янка Купала. У 1918 г. яны з Язэпам Лёсікам выправілі «пінскую гаворку» вадэвілю «на беларускі лад» ды апублікавалі «Пінскую шляхту» ў мінскім тыднёвіку «Вольная Беларусь». Гэтай публікацыяй скарыстаўся ў 1984 г. навуковец Язэп Янушкевіч, рыхтуючы збор твораў Дуніна-Марцінкевіча. А ў дадатку даследчык змясціў арыгінал, адшуканы ў віленскім архіве.

Што можна сказаць пра сам рукапіс? Графалагічная экспертыза даказала, што ён выкананы рукой Марцінкевіча. Ягонаю ж рукою робленыя праўкі і дапаўненні. Аднак ці азначае ўсё гэта, што Марцінкевіч быў аўтарам? У Беларусі пасля паўстання Каліноўскага ва ўмовах забароны на друк адрадзілася практыка рукапіснага капіявання. Тэксты дасылаліся, перадаваліся для зняцця копій, потым вярталіся. Так, у «вялікім куфры» Дуніна-Марцінкевіча быў знойдзены і рукапіс паэмы «Тарас на Парнасе». І не ўсе памятаюць, што спачатку на падставе почырку, аўтарства гэтага твору таксама было прызнанае за панам Вінцэнтам, і пад яго імем «Тарас» быў упершыню апублікаваны ў 1896 г. тым жа Доўнар-Запольскім.

## Аўтар — з Купяцічаў?

Прафесар БДУ Ніна Мячкоўская надрукавала ў «Венскім славістычным альманаху» ў 2000 г. артыкул з красамоўнай назвай: «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч не быў аўтарам вадэвілю «Пінская шляхта». Супастаўленне двух вядомых тэкстаў вадэвілю паказвае, што тэкст на пінскім дыялекце быў зыходным, даводзіць Мячкоўская. Дый паэтыка «Пінскай шляхты» выразна адрозніваецца ад твораў Дуніна-Марцінкевіча на беларускай мове — большай мастацкасцю і сцэнічнасцю.

На след аўтара накіраваў лінгвіст Фёдар Клімчук — унікальны знаўца палескіх гаворак, які ведае асаблівасці маўлення літаральна кожнага хутару. Ён даследаваў мову «Пінскай шляхты» і вызначыў дзве найбольшыя яе складовыя часткі: мясцовая берасцейска-пінская гаворка і «руская» (г.зн. старабеларуская і стараўкраінская) пісьмовая традыцыя, традыцыя царкоўнай мовы, якая часткова захавалася з часоў ВКЛ.

Мова «Пінскай шляхты» сустракаецца ў некалькіх дзясятках вёсак Берасцейшчыны. Для яе характэрная такая рыса, як наяўнасць рэдкага галоснага «умляўту» ў пэўнай пазіцыі. Гэтага гуку няма ў суседніх славянскіх мовах, але ён ёсць у нямецкай: прыкладна як сярэдні між «ю» і «і». У арыгінале п'есы ён абазначаны літарай [ю], часам спалучэннем [іо]: *віон* (27 разоў), *віона* (2 разы), *тюльку* (12 разоў), *зубіоў* (1 раз). У Пінскім раёне большая частка вёсак, дзе людзі гавораць як Пратасавіцкія і Цюхаі-Ліпскія, размешчаная на поўдзень ад Прыпяці. Гэта цяперашнія Барычэвіцкі, Калавуравіцкі (адтуль уласнікі прозвішча Калавур), Лемяшэвіцкі (адтуль Лемяшэўскія), Лапацінскі, Плешчыцкі сельсаветы. А паўночным фарпостам гэтага арэалу ёсць вёскі Купяцічы і Сушыцк Гарадзішчанскага сельсавету (у самім Гарадзішчы змяшчаўся летапісны Пінск, а ў 1945 г. яго жыхары-каталікі амаль у поўным складзе выехалі ў Польшчу, таму няма як высветліць старадаўнюю гаворку гэтай мясціны).

Жыхары глухіх мясцін, разважае Клімчук, звычайна саромеюцца сваёй гаворкі, яны з лёгкасцю пераходзяць на гаворкі больш прэстыжныя. У выпадку ж з «Пінскай шляхтай» аўтар, наадварот, смела і яскрава выкарыстоўвае «хатнюю» мову. «Пінская шляхта», відавочна, ствараласяў населеным пункце з багатымі культурнымі традыцыямі. І Клімчук прапануе версію — сяло Купяцічы на паўночны ўсход ад Пінску, стары манастырскі цэнтр.

Аўтарам, сцвярджае Клімчук, мог быць мясцовы пінчук, але мог быць і выхадзец з іншага рэгіёну. Ва ўсялякім выпадку, ён доўга жыў на Піншчыне і засвоіў мясцовую гаворку. Другі варыянт падаецца больш імаверным — таму што ў мове вадэвілю ёсць пэўная непаслядоўнасць.

«Умляўт» звыкла ўзнікае ў закрытых складах пад націскам — там, дзе ў беларускай мове гук «о» (кот), а ва ўкраінскай — «і» (кіт). А ў «Пінскай шляхце» ёсць 4 выпадкі, калі «умляўт» (графічна пазначаны як «ю») ужыты ў адкрытым складзе і не пад націскам, хоць гэтага ў прыродзе быць не можа? Памылка перапісчыка? Або паказчык, што «Шляхту» пісаў не мясцовы ўраджэнец, які гаворкай авалодаў яшчэ не дастаткова?

Напрацоўкамі Клімчука скарыстаўся гісторык Аляксандр Ільін. Раней у часопісе «Гістарычная брама» ён выстаўляў версію, што вадэвіль напісаў Стэфан Куклінскі. Гэты чалавек паходзіў, праўдападобна, з Падляшша, скончыў Харкаўскі універсітэт і быў дырэктарам Пінскай гімназіі. Па сваіх поглядах ён мог быць аўтарам. Прынамсі, ідэалагічная праца ў яго гімназіі была нікуды не вартая — шмат хто з яе выхаванцаў далучыўся да паўстання 1863 г. Але дзе іншыя праявы такога яскравага літаратурнага таленту?

Пасля ўказанняў на Купяцічы Ільін пачаў шукаць аўтара ў гэтым сяле. Хто мог быць на Піншчыне захавальнікам усходнеславянскай пісьмовай традыцыі? Натуральна, мясцовыя праваслаўныя і уніяцкія святары, разважае А.Ільін. Чаму б не святар Купяціцкай царквы Дзмітры Булгакоўскі, які таксама выкладаў царкоўнаславянскую і расійскую мовы ў Пінскім духоўным вучылішчы? Але ж царкоўнаславянская і старабеларуская мовы — далёка не адно і тое. У XVII ст. паўставалі нават перакладныя слоўнікі гэтых моваў. Свецкая старабеларуская моўная традыцыя прысутнічае ў вадэвілі, бо там стала робіцца спасылкі на Статут Вялікага Княства і адпаведныя праўныя рэаліі. Наколькі мог быць з імі знаёмы ўраджэнец гораду Ялец Арлоўскай губерні Дзмітры Булгакоўскі? Якраз у 1870-я гады яго, выкладчыка Пінскай семінарыі, прызначаюць свяшчэннікам у Купяцічы. Больш за тое, пасля прызначэння ён уступіў у бясконцую і дробязную судовую цяжбу з сваім папярэднікам на Купяціцкім прыходзе Феліксам Дружылоўскім...

## Ці ўсё ж схаваныя таленты Марцінкевіча?

Пытанні, пытанні. Пакуль на іх няма адказаў. Марцінкевіч застаецца імаверным кандыдатам на аўтара. Ён сапраўды ведаў праўныя рэаліі, бо ад 1827 г. служыў у Мінскіх епархіяльнай кансісторыі і крымінальнай палаце. Яму было чаго хавацца з такім антысістэмным творам, напісаным, як мяркуюць, у 1866 г. Ад пан Вінцэнт у той час знаходзіўся пад следствам. Узгадаем характарыстыку, якую даваў свайму палітычна нядобранадзейнаму паднаглядна му павятовы спраўнік А.Сараеў: «Паводзінаў добрых і схаванага вобразу жыцця». З усімі гэтымі Кручковымі пісьменнік мог расправіцца толькі словам. А на аўтографе твору маюцца ўласнаручныя праўкі Дуніна-Марцінкевіча.

Але ж слабы пункт — мова. Марцінкевіч бываў на Палессі, нават збіраў там песні і прыпавесці. Аднак ён прыязджаў у вёску Альпень, але гэта Столінскі раён і гаворка там адрозніваецца ад мовы «Шляхты».

## Разгадка блізкая

След шукання аўтара па мове гаворкі, безумоўна, правільны. Варта пакапаць і ў паўднёвых сельсаветах Пінскага раёну, і сярод жыхароў населеных пунктаў Янаўшчыны, дзе кажуць «віон». Бо Янаўшчына ў XIX ст. лічылася часткай гістарычнай «Піншчыны»...

Чым бы ні скончылася дыскусія вакол аўтарства, выйграюць абодва бакі. Калі вадэвіль сапраўды напісаў Марцінкевіч — значыць, мы не да канца ацанілі яго здольнасці ў гульні мовамі і сімваламі. Калі будзе знойдзены іншы аўтар — мы адзначым заслугу і культурны чын Дуніна-Марцінкевіча ў захаванні фенаменальнага твору.

«Нэхай жэ шчасна розвязка
Пынской шляхтэ од вас будэ!»






**Аўтар «Пінскай шляхты» найхутчэй што быў звязаны з адным з паселішчаў на Піншчыне, дзе ўжываецца рэдкі гук, падобны да нямецкага умляўта. Гэтыя раёны вылучаны колерам. Мапа створаная мовазнаўцам Хведарам Клімчуком.**

**Артыкул Аляксандра Ільіна «Пісьменнік і фальклярыст Дзмітры Булгакоўскі з'яўляецца аўтарам «Пінскай шляхты»? можна прачытаць у «Краязнаўскай газеце», №4—6 за 2009 год.**

# Лідскі замак рэстаўруе будтрэст

Бюджэт рэканструкцыі збудаванага пры Гедыміну замку складзе больш за $20 мільёнаў.

Ставіцца амбітная задача аднавіць першапачатковы выгляд замку і ператварыць яго ў музейны і культурны цэнтр. У замкавым двары збудуюць дом старасты, казармы, кузню, навесы для коней, адновяць галерэю і дзве сярэднявечныя студні. Вакол замку знясуць прыватную забудову, падыходы да яго забрукуюць, збудуюць вялікую аўтастаянку.

Аднак вось што выклікае насцярогу.

За адбудову замку возьмуцца не прафесійныя рэстаўратары, а звычайныя будаўнікі — генеральным падрадчыкам выступіў мясцовы будаўнічы трэст № 19. Ужо абвешчана, што ў працэсе рэканструкцыі будуць выкарыстоўвацца сучасныя матэрыялы і канструкцыі, «якія ў адпаведнасці з правіламі стандартызацыі прайшлі экспертызу і адпавядаюць усім патрабаванням пажарнай, санітарнай, экалагічнай ды іншых службаў». Спачатку будаўнікі плануюць разабраць большасць канструкцыяў замку, даследаваць галоўную вежу. Паўднёва-заходнюю вежу і асноўныя канструкцыі сценаў давядзецца абнаўляць. Падобным чынам — пры ўдзеле непрафесіяналаў і з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў — адбываецца рэканструкцыя гістарычных аб'ектаў па ўсёй краіне — у Мінску, Гродне, Нясвіжы і Міры.

**Паводле s13**

**Лідскі замак**

**пабудаваны ў 1330–я ў атачэнні рэк Лідзея і Каменка паводле дарučэння князя Гедыміна. Уваходзіў у лінію абароны ад крыжакоў Навагрудак—Крэва—Меднікі—Трокі. Быў збудаваны з бутавага каменю і цэглы, меў у плане форму няправільнага чатырохкутніка з дзвюма вежамі. На замкавым двары размяшчаліся праваслаўная царква (у 1533 перанесеная ў горад), жылыя і гаспадарчыя пабудовы, з 1568 — суд, архіў, астрог.**





# Уладзімір Кулікові больш не рэдактар «Роднага слова»

Як стала вядома, Уладзімір Кулікові з канца мая больш не з'яўляецца галоўным рэдактарам часопісу «Роднае слова».

Паводле яго слоў, з гэтай пасады, якую займаў два гады, ён сышоў па ўласным жаданні.

— Проста ў мяне ёсць іншыя планы на жыццё, — патлумачыў прычыну Кулікові.

Разам з тым ў атачэнні рэдакцыі ходзяць размовы, што галоўнага рэдактара папрасілі сысці пасля размяшчэння на старонках часопісу рэкламы грамадскай кампаніі «Будзьма». Сам Уладзімір Кулікові адмовіўся гэта каментаваць.

— Не ведаю, ці так гэта. Прыдумайце адказ самі! — параіў ён нам.

Замест Кулікова рэдактарам «Роднага слова» прызначаная былая галоўная інспектарка Міністэрства адукацыі Зоя Падліпская. Прычыны звальнення свайго папярэдніка яна таксама не называе.

— Кожнага новага рэдактара прызначае міністр, — адзначае Падліпская. — Больш за ўсё мне б не хацелася, каб нешта дрэннае фігуравала пра Уладзіміра Кулікова. Мы ўсе жывём у адной краіне і робім адну справу.

Цікава, што гэта не першая змена галоўнага рэдактара часопісу, ахутаная таямніцай. У 2006 годзе з пасады сышоў Міхась Шавыркін. Афіцыйная фармулёўка гучала як «пагадненне бакоў». Але ж сам былы рэдактар сцвярджаў, што прапанова пакінуць пасаду звязаная са «зместавым напаўненнем часопісу» — маўляў, тут друкуюцца аўтары, якія апошнім часам не ў пашане ў беларускіх уладаў. З 8 жніўня 2007 году загадам Мінадукацыі галоўным рэдактарам быў прызначаны Уладзімір Кулікові.

**«Салідарнасць»**

# Алесь Бадак: «Всемирная литература» знікне, як самастойнае выданне

Але будзе выходзіць у якасці раздзелу ў часопісе «Нёман». Прычына зменаў — малы наклад выдання.

Алесь Бадак, які нядаўна ўзначаліў часопіс «Нёман», распавёў, чым найперш зоймецца на новай пасадзе, а таксама падзяліўся навінамі пра лёс часопісу «Всемирная литература». «Самае новае, што нас чакае ў найбліжэйшы час — гэта з'яўленне двух часопісаў у адным. «Всемирная литература» знікне, як самастойнае выданне, але будзе выходзіць у якасці раздзелу ў часопісе «Нёман», — патлумачыў А. Бадак. Прычынай такіх пераменаў галоўны рэдактар назваў малы наклад «ВЛ». Па яго словах, апошнім часам у выдання ўзніклі праблемы з падпіскай: «Існавала пэўная насцярога ў падпісчыкаў да часопісу. Найперш гэта датычыць індывідуальнай падпіскі». Іншая рэч — «Нёман», які яшчэ ў 1980-я гады выходзіў амаль стотысячным накладам і заваяваў папулярнасць чытачоў па-за межамі Беларусі. Цяпер творы замежных аўтараў будуць друкавацца ў «Нёмане» ў выглядзе асобнага раздзелу, які і будзе называцца «Сусветная літаратура». «Гэта будзе і проза, і паэзія, і эсэістыка, і крытыка», — зазначыў сп. Бадак. Галоўнай праблемай, звязанай з друкаваннем перакладаў, ён назваў пытанне аўтарскіх правоў, наяўнасць якасных перакладаў. «Будзем працаваць — шукаць таленавітых аўтараў і Беларусі, і за мяжой», — дадаў літаратар на развітанне.

**Сямён Печанко**



**Алесь Бадак**

пісьменнік, паэт–песеннік, публіцыст, крытык. Нарадзіўся 28.02.1966 г., в. Туркі Ляхавіцкага раёну Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых. У 1983 г. пасля заканчэння школы паступіў на філалагічны факультэт БДУ. Служыў у Савецкай арміі (1984–1986). Зноў вучыўся ва універсітэце, які скончыў у 1990 г. Сябра СП з 1990 г.

## НОВЫЯ КНІГІ

### Казань пра Чырвоны Касцёл

Праз год мы будзем святкаваць 100-годдзе неараманскай перліны старога Мінску — касцёла Св.Сымона і Алены. Бажніца паўстала, калі царскія ўлады амаль пасля паўвекавой забароны дазволілі пабудову касцёлаў на тэрыторыі Беларусі. Фундатарам велічнага неагатычнага будынку быў Эдвард Вайніловіч, які назваў касцёл у памяць аб сваіх памерлых дзецях Сымону і Алене.

Уладзіслаў Завальнюк, пробашч Чырвонага касцёлу, у форме казані распавядае пра гісторыю бажніцы і пра вычын Эдварда Вайніловіча, хаця, як заўжды ў казані, лёс чалавека — толькі сведчанне Божай волі, адно дзверы ў развагі пра Бога і Боскае.

Кніга аздобленая рэдкімі фотаздымкамі з хрысціянскімі бажніцамі Мінску (не толькі каталіцкімі).

**Уладыслаў Завальнюк. Так хацеў Бог!** Паэма–казань. Мінск: Рымска–Каталіцкая парафія св. Сымона і св. Алены, — 300 ас. 2009.

**Лявон К.**

# Шведскае па-беларуску

Выйшаў зборнік прозы найцікавейшых літаратараў Паўночнага Каралеўства.

У рамках Дзён культуры Швецыі, што праходзілі ў нашай краіне, 9 чэрвеня ў Мінску адбылася прэзентацыя зборніку «Сучаснае шведскае апавяданне».

У кнігу ўвайшлі чатырнаццаць навелаў. Аўтарамі твораў з'яўляюцца вядомыя шведскія пісьменнікі: Петэр Энглюнд, Сесілія Давідсан, Эрык Лёвендаль, Анна Руус, Улін Стыг і г.д. У сваіх творах яны імкнуцца выявіць «абсурднасць існавання ў часе сацыяльных зменаў», паказаць «драматызм штодзённага жыцця» звычайнага чалавека, акрэсліць канфлікты, якія ўзнікаюць нават у самым блізкім для чалавека асяроддзі.

Падрыхтоўка зборніка сталася дэбютам для многіх маладых перакладчыкаў. Як распавядае куратар праекту ад Цэнтру шведскіх доследаў, Вольга Рызмакова (Цвірка), з творамі працавалі пераважна ўдзельнікі курсаў шведскай мовы, што дзейнічаюць пры цэнтры. Убоку не засталіся таксама выкладчыкі, сябры ўстановы ды студэнты Белдзяржуніверсітэту.

«Для зборніка я абрала тых, чые апавяданні найцікавей маглі распавесці беларускаму чытачу пра Швецыю», — распавядае пра крытэры складання зборніку Вольга.

Навелам, якія ўвайшлі ў зборнік, рэдактар кнігі Валянцін Акудовіч даў такую характарыстыку: «Шведская літаратура засяроджаная на выяўленні экзістэнцыяльных перажыванняў чалавека. У цэнтры — драма сям'і і асобы. Але, у той жа час, адчуваецца перманентнае чаканне глабальнай катастрофы, і гэта здзіўляе беларускага чытача. Бо наша зрэпрэсаваная літаратура, у якой герой увесь час бядуе, усё ж такі імкнецца данесці, што «загляне сонца і ў наша ваконца». Магчыма, гэта адбываецца таму, што для беларусаў адчуванне катастрофы сталася ўжо звыклым. Праблемы яны ўспрымаюць па прынцыпе: адной больш, адной менш... Шведскі ж герой нібыта ўвесь час забягае наперад, чакае ў трывозе, калі ж «ляснецца» гэтае яго спакойнае існаванне. І названая акалічнасць дадае пэўны нерв шведскай літаратуры».

**Ганна Кот**



Сучаснае швэдзкае апавяданьне. — Мінск: «Галіяфы», 2009.

## КАНЦЭРТЫ

**Neuro Dubel**

Вялікі летні канцэрт гурту Neuro Dubel пройдзе **18 чэрвеня ў Rockhouse Cafe (вул. Няміга, 12). Пачатак у 20.00.** Кантактныя тэлефоны: (029) 254–49–09, (029) 671–58–65.

**La Madre Naturaleza**

Сумесная музычна–паэтычная акцыя–канцэрт La Madre Naturaleza (Дзень Роднай Зямлі) ансамбляў **«Князь Мышкін», «Ліцвіны», «Шэпт Срэбра»**, а таксама Ярылы Пшанічнага, Віктара Жыбуля, Аксаны Спрынчан, Яраша Малішэўскага адбудзецца **18 чэрвеня а 19-й у фальварку «Добрыя мыслі» (вул.Магілёўская 12/1)**.

## ІМПРЭЗЫ

**Канстанты Ільдэфанс Галчыньскі**

Польскі Інстытут запрашае на Літаратурна–музычны вечар «Песня маёй дарогі», прысвечаны творчасці паэта К. І. Галчыньскага (1905—1953). Імпрэза адбудзецца **19 чэрвеня ў Доме Дружбы (Мінск, вул.Захарава, 28). Пачатак а 17-й.**

**Канферэнцыя «Міленіум Літвы»**

Канфэрэнцыя, прысвечаная тысячагоддзю Літвы, адбудзецца **19 чэрвеня а 10-й у памяшканні Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа (вул.Сурганава, 15)**. Уваход вольны. Удзел бяруць Анатоль Грыцкевіч, Адам Мальдзіс, Эдвард Зайкоўскі, Сяргей Санько і інш.

## ВЫСТАВЫ

**«Набліжэнне»**

**Да 20 чэрвеня кожны дзень, акрамя панядзелка, з 10.00 да 17.00 у Музеі Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** працуе выстава фатаграфіі Сяргея Борсука «Набліжэнне».

**Новыя імёны**

Фотапраект «Новыя імёны» маладых фатографаў Моладзевай фотастудыі «Краявід» **адкрыецца 19 чэрвеня а 18-й у галерэі «Свет Фота» (вул.Прытыцкага, 10) і будзе працаваць да 10 ліпеня**.

## ТЭАТРЫ

### 18 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Пігмаліён»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

### 19 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балету** — «Травіята»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Пігмаліён»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дурніца»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Варшаўская мелодыя»

### 20 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Марыца»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр оперы і балету** — «Лебядзінае возера»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепей»
**Тэатр рускага рамансу** — «Пятрушка–замежнік»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Купалаўскі тэатр** — Вечар, прысвечаны юбілею Валерыя Раеўскага

### 21 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Музычны тэатр** — «Стойкі алавянны жаўнерык»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр оперы і балету** — «Рэквіем»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»

### 22 чэрвеня

**КЗ «Мінск»** — «Ведзьма»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі сконччыцца вайна»
**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Адчыніце кантралёру!»

### 23 чэрвеня

**Тэатр «Хрыстафор»** — «Не жаночая гэта справа!»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»

### 24 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр оперы і балету** — «Дон Кіхот»
**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар'яцелага музыкі»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Філумена Мартурана»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»

### 25 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Капялюш Напалеона»
**Тэатр оперы і балету** — «Баядэрка»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «...Забыць Герастрата!»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»




**Каляндар з аголенымі літаратарамі**

**19 чэрвеня (пятніца) у 18.00 у бар-клубе «6А» (Партызанскі праспект, 6А)** адбудзецца прэм'ера–прэзентацыя календара «Канец словаў». На яго старонках выяўленыя айчынныя літаратары ў негліжэ.

Кожны месяц у гэтым перакідным арт–календары прысвечаны пэўнаму літаратару: тут зьмяшчаецца ўзор яго творчасці, інтэрв'ю, кароткае эсэ, а таксама выява.

Напрыклад, разгарнуўшы на студзені, вы пабачыце як ён ёсць барда і шоумэна Віктара Шалкевіча, на снежні — згледзіце без лішніх дэталяў гардэробу спевака і літаратара Лявона Вольскага.

Адзін з удзельнікаў праекту (выяўлены на «ліпеньскай» старонцы), паэт і перакладчык Андрэй Хадановіч, лічыць, што ў Беларусі аднойчы мусіць распрануцца кожны. «Калі літаратары — святарныя каровы, настаўнікі жыцця, жывыя помнікі самім сабе, аголеная задніца — адзіны жывы атрыбут, які ва ўсім гэтым ёсць. Нешта гарантавана «сваё», — кажа ён.

Падчас прэзентацыі можна будзе набыць каляндар па адмысловым кошце.

**ЛК**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Казка без таямніц

**Тайна Мунакра** (The Secret of Moonacre)

**Жанр:** Казка паводле рамана Элізабэт Гудж

**Адзнака:** 4,5 (з 10)



Асірацелая дзяўчынка Марыя пераязджае ў сядзібу свайго дзядзькі. У старым палацы гераіня дазнаецца, што яна — апошняя прынцэса Поўні. І мусіць выратаваць даліну ад праклёну і прымірыць сем'і, якія здаўна варагуюць.

Рэжысёр Габар Чупа здымае мілыя гісторыі для ўсёй сям'і. Ягоны дзіцячы фільм «Мост у Тэрабітыю», зняты за невялікія грошы і з мінімумам спецэфектаў, кранаў праўдай і спачуваннем.

У казцы «Тайна Мунакра» нешта не заладзілася.

Стужка патрабавала і большых эфектаў, і танчэйшай распрацоўкі характараў. У фільме ёсць чорны леў, што ператвараецца ў сабаку, чароўныя пацеркі, аграмадная і помслівая Поўня — і закаханыя, якія ніяк не заміраццa.

Ёсць дзіўны кухар, адзінарог — і пацешная гувернантка. Кожнае ейнае выйсце — сапраўдны камічны атракцыён з балбатаннем, дурацкімі жэстамі і парасонам.

Але «Тайна Мунакра» — вялая казка для рамантычных дзяўчынак.

І не факт, што глядачкі не заснуць да канца сеансу.

**Андрэй Расінскі**

# Добрая кампанія для Вашых дзетак




## Ідзе набор у дзіцячыя садкі з беларускай мовай.

На гэтае лета аж сем садкоў у Мінску маюць беларускамоўныя групы. Пішам «аж», бо ніколі раней у апошняе дзесяцігоддзе столькі іх не было. Перавага гэтых садкоў — інтэлігентны падбор дзяцей, часам — невялікія групы. Вашы малыя будуць вучыцца разам з дзецьмі з добрых сем'яў — дзеячаў культуры, бізнэсоўцаў, дактароў, навукоўцаў. Менавіта гэтае асяроддзе выбірае для сваіх дзяцей беларускамоўныя садкі і школы ў сталіцы. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

### Мінск

**Дзіцячая дашкольная ўстанова №412 (пр.Газеты Праўда, 64а)** запрашае ў старэйшую ўзроставую групу з беларускай мовай выхавання. Даведкі праз т.: (017) 271-68-47.

**ДДУ №522 (вул.Русіянава, 23)** сёлета набірае малодшую групу. Даведкі праз т.: (017) 260-65-01.

**ДДУ №314 (вул.Багдановіча, 68а)** мае рознаўзроставую групу, тут прымаюцца дзеткі сярэдняга і старэйшага ўзросту. Даведкі праз т.: (017) 234-25-61.

**ДДУ № 534 (вул.Матусевіча, 59)** — цалкам беларускамоўны садок. Даведкі праз т.: (017) 257-76-91.

**ДДУ № 187 (вул.Кахоўская, 64а)** — цалкам беларускамоўны садок. Даведкі праз т.: (017) 213-06-71.

**ДДУ № 234 (вул.Карастаянавай, 19)** набірае рознаўзроставую групу. Даведкі праз т.: (017) 288-50-75.

Мінчукам з Сухарава, якія жадаюць з восені 2009 г. аддаць сваіх дзяцей 3—4 гадоў у беларускамоўны садок па месцы жыхарства, можна звяртацца праз тэлефон: (29) 395-73-99 (Дар'я) або праз e-mail: apalonik@gmail.com.

### Брэст

Таксама арганізуецца беларускамоўная рознаўзроставая група ў брэсцкім дзіцячым садку. Каб яна пачала працаваць у верасні 2010 г., тэлефануйце +(029) 228-44-68 (Мілана) або лістуйце milka-kotka@tut.by ці milka-kotka@mail.ru. Заявы трэба падаць у верасні 2009 г., каб у супрацоўнікаў аддзелу адукацыі быў час падрыхтавацца (у тым ліку і маральна)).

### Гродна

Усе, хто жадае аддаць дзіця ў беларускамоўную групу, звяртайцеся па інфармацыю: тэл. (029) 868-98-82 (Ігар Кузьміновіч).

### Магілёў

**ДДУ № 81** (Дняпроўскі бульвар, 58а (м-н Юбілейны)) — набірае рознаўзроставую групу (4-5 гадоў). Даведкі праз т.: (0222) 23-06-96.

Калі ў іншых гарадах Беларусі арганізуецца група з беларускамоўным выхаваннем, просьба звяртацца ў Рэдакцыю — мы з радасцю паведамім пра Вашую ініцыятыву нашым чытачам, якія маюць такую ж патрэбу.

**Сямён Печанко**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 22—28 ЧЭРВЕНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 22 чэрвеня, панядзелак
### На «Белсаце» — Дзень памяці Васіля Быкава

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 6 серыя
**18.50** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 1
**19.20** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**19.35** «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 2
**20.00** Невядомая Беларусь: «Распавяду вам пра сябе», дак. фільм, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь
*Аўтары фільму атрымалі ў сваё распараджэнне унікальныя запісы гутаркі Алеся Адамовіча з Васілём Быкавым — першых велічыняў беларускай літаратуры. Як вядома, Быкаў быў чалавек непублічны, некаторыя нават назвалі яго «герметычным»: ён рэдка даваў інтэрв'ю, не любіў казаць пра сябе. Аднак Адамовіч быў ягоным блізкім сябрам, якому класік не мог адмовіць у больш разгорнутых і — наколькі гэта магло быць — шчырых адказах.*
*Алесь Адамовіч — сам таленавіты пісьменнік, знаны даследнік, аўтар кніг-інтэрв'ю, доктар філалагічных навук — меўся напісаць кнігу і пра свайго знакамітага сябра і паплечніка. Ён прайшоў той жа шлях, што і Быкаў, толькі вайну сустрэў у трохі маладзейшым веку — у 16 гадоў. І як Быкава, яго праследавалі за самастойныя ацэнкі нямецка-савецкае вайны, якія разыходзіліся з канцэпцыямі афіцыйнай савецкай гістарыяграфіі. Не дзіва, што суразмоўцы разумелі адзін аднаго з паўслова...*
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** «Застава», маст. фільм, рэж. Райка Грліч, 2006 г., Вялікабрытанія—Сербія і Чарнагорыя—Боснія і Герцагавіна—Македонія—Славенія—Харватыя
**23.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**23.20** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка»
**23.40** Аб'ектыў

### 23 чэрвеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Угару, уніз», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2004 г., Чэхія
**19.55** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.40** Побач з намі
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Звычайны прэзідэнт», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1997 г., Беларусь
**22.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 12 серыя
**23.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**23.45** Аб'ектыў

### 24 чэрвеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 35 серыя
**18.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 12 серыя
**19.40** «Беларускі фронт, альбо Размовы пра мову», дак. фільм, рэж. Віктар Корзун, 2007 г., Беларусь
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** «Угару, уніз», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2004 г., Чэхія
**23.15** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.45** Аб'ектыў

### 25 чэрвеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 36 серыя
**18.50** «Апошні сезон», серыял: 8 серыя
**19.45** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча
**20.05** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.25** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя: як гэта робіцца», дак. фільм, рэж. Катарына Рэйгер, Эрык ван дэн Брук, 2001 г., Галандыя
**22.30** МакраФон: «Сон-трава», канцэрт гурту «Троіца», ч. 2
**23.05** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка»
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.40** Аб'ектыў (паўтор)

### 26 чэрвеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 37 серыя
**18.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.25** Форум (ток-шоу): Каб людзьмі звацца
**20.15** Кінастужка (агляд кінарынку)
**20.40** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.35** «У Бога за пазухай», камедыя, рэж. Яцэк Бромскі, 1998 г., Польшча
**23.10** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**23.40** Аб'ектыў

### 27 чэрвеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**18.05** «Кіно і катлеты», дак. фільм, рэж. Вольга Мікалайчык, 2008 г., Беларусь
**19.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.45** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, 1996 г., Польшча
*Белавежская дамова і распад Савецкага Саюзу прынеслі незалежнасць. Адною з «адпушчаных на волю» краінаў стала Беларусь. Пасля ранніх 1990-х, калі людзі надыхаліся вольным паветрам і свабодаю слова на роднай мове, надышоў час пагоршання сітуацыі. У фільме паказваецца «другая Беларусь»: асобы, якія прынялі гэты выклік і пачалі цяжкую справу — пабудову новай дзяржавы. Гэта звычайныя людзі: рабочыя, сяляне, мастакі, журналісты, дзеячы свабодных прафсаюзаў, якія зарганізоўвалі мітынгі, сядзелі ў вязніцах або былі змушаныя эміграваць.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны)
**21.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.45** Чалавек-эпоха: «Франка: на варце Захаду» , дак. фільм, рэж. Хаўмэ Сэра, 2006 г., Іспанія
*Франсіска Франка быў кіраўніком іспанскай дзяржавы цягам амаль сарака гадоў — з 1939-га — пасля перамогі ў грамадзянскай вайне — і аж да смерці ў 1975-м, калі ягоны сыход даў магчымасць краіне паступова перайсці да дэмакратыі. Але для бальшыні ягонае імя стала сінонімам змрочнага перыяду іспанскай гісторыі, хоць для некаторых ён застаўся правадыром, які ўратаваў Айчыну ад камунізму. Фільм паказвае жыццё Нязменнага Вартавога Захаду, як ён сам сябе называў, з ранняга дзяцінства да самае смерці, расказвае пра ягонае паходжанне, маніі, вайсковую кар'еру і пачуццё гумару.*
**22.45** «Апошні сезон», серыял: 9 серыя
**23.40** Аб'ектыў




### 28 чэрвеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 7 серыя
**19.05** МакраФон: «Рок па вакацыях—1996», канцэрт
**19.55** Форум (ток-шоу): Каму служыць беларускі чыноўнік
**20.40** Хто ёсць кім: «Бард і літаратар Міхаіл Валодзін. Тут мой дом»
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедымін» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.55** Фільматэка майстроў: «Чалавечая прырода», маст. фільм, рэж. Мішэль Гандры, 2001 г., ЗША.
*Фанатычны навуковец Натан ставіць эксперыменты на жывёлах. Напрыклад, вучыць мышэй этыкету, каб зрабіць свет лепшым. Аднойчы яму прымроіўся унікальны шанец перавыхаваць дзікуна Пафа, які лічыць сябе малпаю...*
**23.40** Аб'ектыў




**Так выглядае вокладка новага нумару часопісу Magazyn Polski (друкаваны орган непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў Беларусі (СПБ). Ён выходзіць накладам 2 тысячы экзэмпляраў і распаўсюджваецца праз структуры СПБ. За аснову для жарту было ўзятае фота з фільму «Сібірскі цырульнік», дзе Мікіта Міхалкоў зняўся ў ролі Аляксандра III.**

# Купляйце беларускае

**Масква можа не абмежавацца санкцыямі супраць малочнай прадукцыі. Што, калі яна забароніць увоз у РФ галоўнага беларускага ноу-хау? Фельетон Лёліка Ушкіна.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Ішоў 2012 год. Яшчэ не адгучала рэха апошняй расійска-беларускай гандлёвай вайны за канцылярскія кнопкі, як пачалася новая.

Навіна была як гром сярод яснага неба. Галоўны санітар Расіі забараніў імпарт з Беларусі ідэяў саюзнай дзяржавы. Як антысанітарных. «Беларуская прадукцыя ідэяў саюзнай дзяржавы не адпавядае расійскім стандартам якасці», — паведаміла Масква.

Пад каток санкцый трапілі прыкладна 1200 назваў беларускіх саюзных ідэалагем, у тым ліку самыя папулярныя на рынку суседзяў, як «беларусы тыя ж самыя расійцы», «на захад ад Смаленску няма ніводнага расійскага салдата», «мы сяброўствам з Масквою гандляваць не будзем, я так Салану і сказаў».

Спачатку Мінск вырашыў абысці забароны за кошт невялікага рэбрэндынгу. У Беларусі з'явіліся такія фразы як «расійцы тыя ж самыя беларусы» або «мы сяброўствам з Расійскай Федэрацыяй гандляваць не будзем, я так Барозу і паведаміў». Адначасова прэса пісала, што ніякай гандлёвай вайны няма, а беларускія ідэолагі вось-вось атрымаюць сертыфікаты, неабходныя для працы на расійскім рынку канцэпцый.

Тым часам у кулуарах перамоваў прадстаўнікі расійскай тандэмакратыі і кантраляваныя імі тлустыя алігархічныя каты не хавалі, што жадаюць прыбраць да рук галоўны беларускі цэх па вытворчасці саюзных ідэяў. Ну, або, прынамсі, акцыянаваць яго, а акцыі падзяліць па-братэрску. Калі цэх даведаўся пра гэтыя планы, ён перажыў шок і два дні не мог гуляць у хакей.

«Лепей стоячы, чым на каленях!» — была рэакцыя беларускага боку. Кожную гадзіну па БТ паказвалі простых расіянаў, якія плакаліся, што жыць не могуць без таго, каб нехта ім не казаў, што беларусы — тыя самыя расійцы. А вядучыя «Панарамы» палохалі, што вакантную нішу беларускіх ідэяў саюзнай дзяржавы можа заняць кітайская падробка кшталту «манчжуры тыя ж расійцы».

У адказ заляскаў калькулятар «Газпрому»: пералік цэнаў на энерганосьбіты па новых тарыфах выліўся ў рахунак, роўны сумарнаму ВУП Рэспублікі Беларусь ад кебічаўскіх часоў да нашых дзён. Адначасова расійскі ўрад заяўляў, што гэта спрэчка гаспадарчых суб'ектаў, на якую ён не ўплывае, заклікаў залішне не палітызаваць пытанне забароны на ўвоз саюзных ідэяў і выказваўся за супрацоўніцтва з Беларуссю па ўсіх напрамках у канструктыўным рэчышчы. Падкрэсліваючы, што Беларусь і Расія — адна сям'я.

Афіцыйны Мінск таксама дэклараваў гатоўнасць яшчэ глыбей пашыраць палітычныя і эканамічныя беларуска-расійскія сувязі. Адначасова мытнікі пачалі выбарачна прыпыняць расійскія аўто і праглядаць іх на наяўнасць ідэй кантраляванай дэмакратыі. У адказ беларусаў на маскоўскіх будоўлях пачалі правяраць на прадмет саюзнай рыторыкі.

Першая фаза гандлёвай вайны скончылася фенаменальнай выхадкай Мінску. Беларускія спартсмены адмовіліся ехаць на Алімпіяду ў Сочы. МЗС заявіла, што Гульні нелегітымныя.

## ЖАРТЫ

* * *

Многія блытаюць разумовую працу з адсутнасцю фізічнай.

* * *

У савецкія часы разумнымі лічыліся тыя, хто мог чытаць між радкоў.

Цяпер яны глядзяць між тэлеканалаў.

* * *

Раней, калі прыходзілі госці, гаспадар ішоў у склеп па пачастунак. Цяпер ён ідзе і чакае там, пакуль госці сыдуць.

* * *

Супрацоўнікі ваенкаматаў ходзяць у цырк і выглядаюць там маладых людзей, якія смяюцца.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншую Паўліну** са здачай экзаменаў! Даражэнькую пляменніцу Паўліну віншую са здачай усіх выпускных экзаменаў на дзясяткі. Так трымаць і на тэставанні! Дзядзька Андрэй

**Віншуем Насту і Віталя Броўкаў** з нараджэннем дачкі Міланы. Нашаму роду няма пераводу! Сябры

### СПАЧУВАННІ

**Самыя шчырыя спачуванні Кацярыне Глод** у сувязі са смерцю любай бабулі. Няхай яна спачывае ў спакоі. Калегі

### КВАТЭРА

**Здам двухпакаёўку** ў цэнтры. Пасля рамонту. Тэл. (029) 162-46-12

### АРШАНСКАЯ БІТВА

**Працягваецца падрыхтоўка** да традыцыйнага фэсту беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская Бітва». Запрашаем беларускіх выканаўцаў да ўдзелу ў народным святе. Для інфармацыі: vorsafest.livejournal.com. Сувязь: vorsha2009@gmail.com

### ПРАЦА

**Шукаю сталую працу рэдактара**, стыль-рэдактара або карэктара («наркамаўка», «тарашкевіца», лацінка). Стаж – 6 гадоў. Т.: 286-45-73, (044)704-82-71. Эдвард

**Пераклад** з расійскай на беларускую. Т.: 286-45-73, (044)704-82-71. Эдвард

## СТОП-КАДР




**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## АНОНС




**Чытайце ў наступным нумары «НН»: працяг цыклу «Палітбюро-2009» — Андрэй Кабякоў.**

## IN MEMORIAM



### Сяргей Панькоўскі

Памёр філосаф Сяргей Панькоўскі — у мінулым дэкан ЕГУ, на пачатку 1990-х — дарадца старшыні Вярхоўнага Савету Станіслава Шушкевіча. Да самай смерці Сяргей Панькоўскі заставаўся выдаўцом інтэрнэт-часопісу «Наша меркаванне» nmnby.org. Быў сузаснавальнікам Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў. Прычынай смерці стаў панкрэатыт. Было яму 53 гады. Пахаванне адбылося ў панядзелак на Паўночных могілках. Рэдакцыя «НН» выказвае шчырыя спачуванні сям'і і калегам нябожчыка. Няхай ягоная справа не загіне.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У Рэчыцкім павеце круціцца нейкі Капусцёнак з шайкай уцёклых арыштантаў і не раз ужо абіраў народ, а так спрытна перабягае з адной губерні ў другую, суседнюю, што наша паліцыя ніяк не можа даць рады гэтым зладзеям.

**«Наша Ніва». №23. 1909**

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6015. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 16.06.2009.
Замова № 3234.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9771819161008 09023